БІЯРАСКЛАДАЛЬНЫ ПОСУД ВЫРАТУЕ ЭКАЛОГІЮ 6

ЯК ЗМЯНІЦЬ РАЦЫЁН БЕЗ ШКОДЫ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 САКАВІКА 2022 г. АЎТОРАК № 50 (29672)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

«Работа па карэкціроўцы заканадаўства ў сувязі з прынятымі зменамі ў Канстытуцыю ўжо распачата. Плануючы работу над законапраектамі на 2022 год, мы разумелі, што калі людзі выкажуцца ў падтрымку навацый Асноўнага Закона, то прыйдзецца прыводзіць у адпаведнасць шмат нарматыўных прававых і заканадаўчых актаў. Сёння гэтая работа ўжо распачата. Сфарміраваныя рабочыя групы, куды ўваходзяць дэпутаты, члены Савета Рэспублікі, і адпрацоўваюцца тыя пытанні, якія трэба ўрэгуляваць у сувязі з прыняццем дапаўненняў і змяненняў у Асноўны Закон нашай краіны».

ГІСТОРЫЯ, НАКІРАВАНАЯ Ў БУДУЧЫНЮ

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Канстытуцыі.

У бягучым годзе гэта свята напоўнена асаблівым сэнсам. Сёння ўступаюць у сілу прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме канстытуцыйныя змяненні. Мы адкрываем новую главу нашай гісторыі — гісторыі сучаснай, накіраванай у будучыню Беларусі. Умацоўваючы прававы падмурак грамадства, ствараем для наступных пакаленняў надзейны механізм абароны спрадвечных каштоўнасцяў, нацыянальнай памяці і традыцыйнага ўкладу жыцця.

Беларусы зрабілі свой выбар, прадэманстраваўшы грамадзянскую сталасць, прыхільнасць да мірнага, стваральнага, эвалюцыйнага развіцця краіны.

Захаваўшы асновы суверэннай дзяржавы, якая гарантуе сацыяльную абароненасць грамадзян, мы ўдасканалілі інстытут народаўладдзя і стварылі сістэму кіравання, якая адпавядае выклікам нашага часу.

Разам нам давядзецца ў поўнай меры раскрыць патэнцыял абноўленага Асноўнага Закона ў мэтах умацавання адзінства народа, паспяховай самарэалізацыі кожнага чалавека, забеспячэння законнасці і правапарадку.

Перакананы, што, абапіраючыся на палажэнні Канстытуцыі, мы зробім нашу Беларусь яшчэ больш моцнай, прыгожай і шчаслівай краінай.

Жадаю ўсім здароўя, дабра, узаемаразумення, новых здзяйсненняў на карысць роднай Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Напярэдадні Дня Канстытуцыі ў сталічным музеі Вялікай Айчыннай вайны ў рамках Усебеларускай патрыятычнай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі» адбылося ўручэнне пашпартоў юным грамадзянам краіны: шаснаццаць юнакоў і дзяўчат — выдатнікі вучобы, актывісты і спартсмены з усіх абласцей — атрымалі свае першыя дакументы з рук намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі. Сярод іх былі Валерыя БЕЛАВУС з Оршы, Паліна ЗАРЭЦКАЯ са Слаўгарада, Эмілія ЛОЙКА з Кобрынскага раёна, Юлія ЛУК'ЯНЧЫК і Уладзіслава НІКІЦЕНКА з Хойнікаў (*на фота*).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Год гістарычнай памяці

БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМІ ПЕРАЕМНІКАМІ ВЕТЭРАНАЎ

Урачыстымі і відовішчнымі мерапрыемствамі адзначылі 105 гадоў беларускай міліцыі ў Брэсце

У мінулую суботу ў Брэсце адбыліся маштабныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Года гістарычнай памяці. У гонар 105-й гадавіны беларускай міліцыі на Брэсцкі вакзал з Мінска прыбыў Цягнік памяці. Састаў з 19 вагонаў прывёз на гераічную брэсцкую зямлю супрацоўнікаў міліцыі з усіх рэгіёнаў краіны. Многія прыехалі з сем'ямі. З усіх абласцей сабраліся вартавыя парадку, каб ушанаваць памяць саслужыўцаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

СТАР. 5

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

КАРОТКА

- У Беларусі будуць сеяць больш грэчкі і проса.
- **МАРТ папярэдзіў аб недапушчальнасці змянення цаны тавару пасля прыняцця заказу інтэрнэт-крамай.**
- У лясах Брэсцкай вобласці ўстанавіўся III клас пажарнай небяспекі.
- **Нераставая забарона на лоўлю рыбы ўводзіцца з 20 сакавіка ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях.**
- Гісторыю развіцця медыцыны і аптэчнай справы ў Беларусі пакажуць на выставе ў НББ.
- **XXIX Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш адкрыецца 23 сакавіка ў БелЭкспа.**
- Гомельская абласная дзіцячая бальніца медрэабілітацыі вяртаецца ў звычайны рэжым работы.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Нам неабходна знайсці мадэль узаемаадносін і супрацоўніцтва, якая адпавядала б інтарэсам дзвюх краін»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі на сустрэчы з паслом Кітая ў нашай краіне Се СЯАЮНАМ

«Адносіны Беларусі з Кітайскай Народнай Рэспублікай — найважнейшы прыярытэт у знешняй палітыцы і эканоміцы нашай краіны. Знешнеэканамічныя і знешнепалітычныя аспекты іграюць важнейшую ролю. Мы шмат зрабілі за апошнія гады. Асабліва за той час, калі старшынёй (КНР — **«Зв.»**) стаў і да гэтага часу з'яўляецца Сі Цзіньпін», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыню КНР Сі Цзіньпіна кіраўнік краіны назваў вялікім сябрам беларускага народа, з якім і ў яго асабіста склаліся вельмі добрыя адносіны. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, менавіта падчас кіравання КНР Сі Цзіньпінам беларускі народ па-сапраўднаму даведаўся, што з сябе ўяўляе Кітай і кітайскі народ, і што ён з'яўляецца нашым сябрам.

«У сувязі з тымі падзеямі, што складваюцца ў нашым рэгіёне, нам належыць коратка абмеркаваць гэту сітуацыю і намеціць дадатковыя шляхі супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Пры гэтым я хачу падкрэсліць: я не настойваю на тым, каб у сувязі з санкцыямі, уведзенымі супраць Расіі і Беларусі, Кітай нёс нейкую адказнасць і нешта страчваў. У гэтай сітуацыі нам неабходна знайсці мадэль узаемаадносін і супрацоўніцтва, якая адпавядала б інтарэсам дзвюх краін», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго ацэнкі, у партнёрства дзвюх краін заўсёды была такая мэта, а гэтым часам некаторыя рэчы маюць патрэбу толькі ў канкрэтызацыі.

«На гэту тэму і хацеў бы паразмаўляць з вамі і прасіў бы вас данесці гэта да кіраўніцтва Кітайскай Народнай Рэспублікі, да старшыні КНР для таго, каб яны больш поўна былі інфармаваныя пра нашу пазіцыю і нашы дзеянні ў гэты няпросты час у Цэнтральнаеўрапейскім рэгіёне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

Даведка

Кітай уваходзіць у тройку найбуйнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі. Летась тавараабарот склаў 5,1 мільярда долараў ЗША. З іх беларускі экспарт — 913 мільёнаў. Наша краіна пастаўляе ў Кітай ялавічыну, мяса птушкі, малочныя прадукты, лесаматэрыялы і цэлюлозу. Аб'ём гандлю паслугамі летась склаў 735 мільёнаў долараў з дадатным для Беларусі сальда ў 66 мільёнаў. Паміж краінамі ўстанавілася трывалае інвестыцыйнае супрацоўніцтва. За апошнія 30 гадоў Кітай уклаў у нашу эканоміку больш за 2,6 мільярда долараў.

Каментарый у тэму

«У КІТАЯ І БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Се СЯАЮН адзначыў у гутарцы з журналістамі: «Мы з вашым Прэзідэнтам правялі вельмі добрую размову, у якой абмеркавалі галоўныя кірункі супрацоўніцтва для нашых краін. Мы таксама падвялі вынікі стану супрацоўніцтва нашых краін у разнастайных галінах. Мы закранулі тэмы і палітычнага ўзаемадзеяння на міжнароднай арэне, і дзелавога супрацоўніцтва ў эканоміцы, гандлёвай сферы. Акрамя таго, мы абмеркавалі сумесную барацьбу з пандэміяй».

Пасол адзначыў, што Кітай выступае супраць санкцыйнага рэжыму, уведзенага заходнімі краінамі супраць Беларусі, і лічыць яго неабгрунтаваным.

«У гэтай складанай сітуацыі ў эпідэмічны перыяд дадзеныя фактары негатыўна ўплываюць на сусветную эканоміку. Але іх кітайска-беларускае супрацоўніцтва вытрымае і захавае добрую дынаміку свайго развіцця», — дадаў Се Сяаюн.

Кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва падкрэсліў, што летась значна павялічыўся ўзровень сумеснага тавараабароту краін, асабліва экспарт беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі. Дае добрыя вынікі Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Па словах сураспмоўніка, у 2021 годзе ў ім зарэгістравана ўжо 85 рэзідэнтаў з 15 краін, заяўленыя інвестыцыі — больш за 1,2 мільярда долараў.

«Гэтыя факты сведчаць пра тое, што ў Кітая і Беларусі ёсць вялікі патэнцыял і перспектывы для супрацоўніцтва», — рэзюмаваў пасол.

Акцэнты

Наталля КАЧАНАВА:

«Ва ўмовах санкцый сёлетні Форум рэгіёнаў набывае асаблівае значэнне»

Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі ў суботу, 12 сакавіка, прайшло пасяджэнне першага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Фота Бел ТА.

Спікер верхняй палаты парламента паведаміла ўдзельнікам нарады, што правядзенне чарговага, дзявятага па ліку, форуму запланавана ў Гродне 23—24 чэрвеня.

— Мы сёння пачынаем работу над падрыхтоўкай значнага мерапрыемства — Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які праходзіць штогод па чарзе ў абедзвюх краінах, — нагадала спікер. — Вы ведаеце, што пачатак гэтага форуму быў пакладзены ў 2014 годзе. Першы форум праходзіў па ініцыятыве Савета Федэрацыі і Савета Рэспублікі. Сёлета яго прымае наша краіна.

Наталля Качанава адзначыла, што нягледзячы на тое, што гэта толькі першае пасяджэнне аргкамітэта, Савет Рэспублікі разам з Саветам Федэрацыі ўжо адпрацавалі шэраг пытанняў: у прыватнасці, вызначаны месца, дата правядзення і тэматыка форуму.

Так, у якасці тэмы арганізатары акрэслілі «Ролю міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў у Саюзнай дзяржаве».

— Кожны раз, калі мы вызначаем тэматыку правядзення гэтага важнага шырокамаштабнага мерапрыемства, мы разумеем, што правядзенне самога форуму — гэта вяршыня работы, якая праводзілася на працягу года, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Вядома, для нас вельмі важныя падпісаныя кантракты, дагаворы, якія заключаюцца па супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі Расіі і Беларусі.

Яна падкрэсліла: бакам важныя тыя пытанні, якія вызначаюць далейшую стратэгію развіцця па тым ці іншым кірунку. На леташнім форуме, напрыклад, гэта былі навука і інавацыі. Паводле ацэнкі спікера, быў зададзены сур'ёзны тон гэтай тэматыцы.

Старшыня Савета Рэспублікі выказала ўпэўненасць, што вобласці ўжо працуюць па тых кантрактах, якія павінны быць заключаны.

— Акрамя таго, на Вышэйшым дзяржсавеце кіраўнікамі нашых дзяржаў былі падпісаныя 28 дарожных карт нашага супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй, — нагадала Наталля Качанава. — Савет Федэрацыі і Савет Рэспублікі ўзялі на сябе адказнасць за далейшую рэалізацыю гэтых праграм, у частцы, якая датычыцца нас. Я хацела б, каб вы адказна паставіліся да гэтага мерапрыемства.

Трэба сказаць, што на пасяджэнне запрасілі членаў Савета Рэспублікі, кіраўніцтва міністэрстваў і ведамстваў, у студыях на сувязі былі губернатары і старшыні абласных Саветаў дэпутатаў.

— Сёлета Форум рэгіёнаў набывае асаблівае значэнне для нас, — акцэнтавала ўвагу ўдзельніка Наталля Качанава і растлумачыла. — Тады, калі ў адносінах да нашай краіны і Расіі наўмысна дзень пры дні ўводзяцца нейкія новыя абмежаванні, санкцыі, мы павінны разумець, што гэта, як сказалі кіраўнікі нашых краін, яшчэ і час нашых магчымасцяў. Будзем рабіць так, каб нашы людзі не адчулі тых абмежаванняў, якія ўводзяцца сёння з боку Захаду.

З пункту гледжання спікера, сёлетняе мерапрыемства мае і яшчэ адзін важны момант.

— Гэта яшчэ адна добрая пляцоўка, дзе мы можам абмяняцца думкамі, падзяліцца ідэямі, выказаць свае прапановы. Таму я прашу ўсіх актыўна ўключыцца ў гэтую работу, — заклікала Наталля Качанава і выказала ўпэўненасць, што сёлета сума падпісаных кантрактаў і дагавораў павінна быць значна большай, а супрацоўніцтва — перайсці на новы ўзровень.

У гутарцы з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла значнасць тэмы рэгіянальнага супрацоўніцтва.

— У цяперашніх умовах прынятае шмат гадоў таму рашэнне (аб правядзенні Форумаў рэгіёнаў. — **Заўв. аўт.**) было абсалютна правільным, бо мы бачылі вынікі гэтай работы. Але ў цяперашніх умовах гэта набывае абсалютна новае значэнне, таму што санкцыі, уведзеныя ў дачыненні да нашых дзвюх краін, нам яшчэ раз даюць разуменне, наколькі важна быць разам і супрацоўнічаць абсалютна па ўсіх напрамках у жыцці нашых краін. Гэта і эканоміка, і маладзёжная палітыка, і сацыяльная сфера, — падкрэсліла яна і выказала спадзяванне, што форум, як заўсёды пройдзе зладжана, арганізавана і цікава.

У завяршэнне адзначым, што сёлета да мерапрыемстваў форуму дадасца яшчэ адна падзея, якая па задуме ініцыятараў праекта павінна арганічна інтэгравацца ў яго канву, — маладзёжны праект «Цягнік памяці», які зробіць прыпынак у Гродне ў час правядзення Форуму рэгіёнаў.

Вольга АНУФРЫЕВА.

УЗРОВЕНЬ ДАВЕРУ І ЎЗАЕМАВЫГАДНЫЯ РАШЭННІ

Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі правялі сустрэчу ў Маскве

«Мэта санкцый супраць Беларусі — павялічыць колькасць незадаволеных». Так сутнасць санкцыйнага рэжыму супраць Беларусі патлумачыў прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА. Учора ў Доме ўрада ў Маскве ён правёў перагаворы са сваім калегам Міхаілам МІШУСЦІНЫМ.

«Мэта ўсіх гэтых дзеянняў зразумелая — выклікаць крызіс эканомікі, рост колькасці незадаволеных, зрабіць новую спробу расхістаць краіну і прывесці да ўлады антырасійскі рэжым на аснове збеглай апазіцыі», — перадае словы беларускага прэм'ер-міністра прэс-служба ўрада.

Па словах кіраўніка Саўміна, у такіх умовах урады павінны дзейнічаць хутка і ўзгоднена. Раман Галоўчанка падкрэсліў, што ў гэтых складаных умовах беларускі эканамічны сектар разлічвае на падтрымку Расіі.

«Мы пацвярджаем гатоўнасць рэалізаваць усе дамоўленасці аб эканамічнай інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Але ў сённяшніх умовах у сувязі са змяненнем абстаноўкі маецца вострая неабходнасць аператыўнай рэалізацыі тых мер падтрымкі, якія адкладаліся на пасля», — канстатаваў прэм'ер-міністр. Сярод іх — рэструктурызацыя крэдытнай запазычанасці, пераход на новую сістэму цэнаўтварэння на расійскую нафту для беларускіх НПЗ, фіксацыя цэн на прыродны газ у расійскіх рублях, нарошчванне паставак машынабудаўнічай прадукцыі на расійскі рынак. Вельмі важна, акцэнтаваў Раман Галоўчанка, удзельнічаць прадпрыемствам у рэалізацыі праграм імпартазамяшчэння.

«Неабходны паўнавартасны ўдзел абароннага сектара эканомікі Беларусі ў рэалізацыі мерапрыемстваў дзяржабаронзаказу Расійскай Федэрацыі, зняцце адміністрацыйных бар'ераў у сферы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Гэту тэму асабліва не абмяркоўвалі апошнім часам. Я лічу, што яна дарма выпала. Неабходна паглядзець на яе прадметна», — заявіў Раман Галоўчанка.

Па яго словах, той узровень адносін, даверу, што ёсць паміж урадамі, дазволіць знайсці ўзаемавыгадныя рашэнні санкцыйных праблем.

Марыя ДАДАЛКА.

З нагоды

СІЛА АГУЛЬНАГРАМАДЗЯНСКАГА КАЛЕКТЫЎНАГА РОЗУМУ

Усебеларускі народны сход як прадаўжальнік традыцый шырокага народнага прадстаўніцтва

15 сакавіка — асаблівы дзень у жыцці нашага грамадства і дзяржавы. У гэты гістарычны дзень у 1994 годзе была прынята новая Канстытуцыя, а сёння ўступае ў сілу абноўлены Асноўны Закон XXI стагоддзя, які адкрывае новую старонку ў далейшым умацаванні суверэннай дзяржаўнасці, узаемнага даверу паміж дзяржавай і грамадствам, нацыянальнага адзінства і развіцця суверэннага народаўладдзя.

Дэмакратыя (народаўладдзе) прайшла вельмі працяглы шлях развіцця і атрымала дакладнае выяўленне і замацаванне ў якасці прынцыпу народаўладдзя ў сучасных канстытуцыях. Канстытуцыя Беларусі замацоўвае не толькі сам прынцып народаўладдзя, але і дэмакратычныя формы яго рэалізацыі. Як вядома, асноўнымі формамі ажыццяўлення народаўладдзя з'яўляюцца прамая (непасрэдная рэалізацыя ўлады народам) і прадстаўнічая дэмакратыя, якая выяўляецца ў дзейнасці асоб, абраных народам. У частцы першай артыкула 3 Канстытуцыі Беларусі яны замацаваны наступным чынам: адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ; народ ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй. Найважнейшымі з формаў прамой дэмакратыі з'яўляюцца рэферэндум, выбары і адкліканне дэпутатаў. 27 лютага 2022 года адбыўся рэспубліканскі рэферэндум па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, які стаў рэальнай канстытуцыйна-прававой формай прамога народаўладдзя беларускага народа. Абноўленая Канстытуцыя, у распрацоўцы і абмеркаванні якой удзельнічала больш за мільён беларусаў, удасканаліла канстытуцыйна-прававы механізм ажыццяўлення канстытуцыйнага кантролю, ажыццявіла дэканцэнтрацыю дзяржаўнай улады, вызначыла ідэалогію беларускай дзяржавы, мадэль грамадзянскага грамадства і каштоўнасныя арыенціры беларусаў, а таксама новыя перспектыўныя кірункі развіцця эканомікі і грамадства і стварыла асновы для павышэння эфектыўнай работы органаў улады і кіравання.

Да аднаго з найважнейшых дапаўненняў Канстытуцыі трэба аднесці палажэнні аб Усебеларускім народным сходзе (далей — УНС) і яго паўнамоцтвах. Наданне канстытуцыйнага статусу УНС Прэзідэнт Беларусі 4 сакавіка 2022 года на ўрачыстай цырымоніі падпісання Рашэння рэспубліканскага рэферэндуму ацаніў як акт гістарычнай справядлівасці, які ўзаконіў старажытную традыцыю нашай славянскай дэмакратыі. Спрадвеку, паводле яго слоў, на беларускай зямлі народнае веча было ў авангардзе прыняцця найважнейшых дзяржаўных рашэнняў. Дарэчы, вечавая дэмакратыя існавала да канца XV стагоддзя ў Полацку, Смаленску, Кіеве, Ноўгарадзе і ў воласцях.

Абноўленая Канстытуцыя разглядае УНС як найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду. Гранічная колькасць дэлегатаў УНС складае 1200 чалавек, што дазваляе забяспечваць шырокае народнае прадстаўніцтва для ўдзелу ў яго рабоце. У прыватнасці, дэлегатамі УНС з'яўляюцца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, у лік якіх будуць уваходзіць члены найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў (прафсаюзы, «Белая Русь», БРСМ) і іншых патрыятычных арганізацый. Дэлегаты УНС бяруць удзел у яго рабоце без адрыву ад працоўнай (службовай) дзейнасці, што ўмацоўвае іх сувязь з народам, дае магчымасць ведаць яго чаканні і інтарэсы.

Варта адзначыць, што статус УНС у абноўленай Канстытуцыі замацаваны пасля главы 3 «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь», г. зн. пасля статусу Прэзідэнта Беларусі. Гэта сведчыць аб надзяленні УНС шырокім аб'ёмам рэальных уладных паўнамоцтваў, яго ролі ў прыняцці найважнейшых дзяржаўных рашэнняў, у развіцці грамадства і дзяржавы, аўтарытэце ў свядомасці беларускага народа, які ён сцвярджаў, дэманструючы найлепшыя практыкі беларускага народаўладдзя, пачынаючы з Першага Усебеларускага народнага сходу, які адбыўся ў кастрычніку 1996 года. Для ўдзелу ў ім было абрана 4740 дэлегатаў. Прэзідэнт Беларусі звярнуўся да іх з дакладам «Толькі народ мае права вырашаць свой лёс». Наступныя УНС працягнулі яго дэмакратычныя пачаткі. Шосты УНС, які адбыўся ў лютым 2021 года, ухваліў асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады. На ім Прэзідэнт Беларусі выступіў з дакладам «Аб адзінстве, развіцці і незалежнасці».

У мэтах забеспячэння стабільнасці канстытуцыйнага ладу, легітымнасці органаў дзяржаўнай улады, кансалідацыі грамадства і дзяржавы УНС надзелены шырокімі паўнамоцтвамі. У прыватнасці, згодна з артыкулам 89[3] абноўленай Канстытуцыі, УНС: зацвярджае асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, ваенную дактрыну, канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь; слухоўвае прэм'ер-міністра аб выкананні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь; прапаноўвае змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю, правядзенне рэспубліканскіх рэферэндумаў; устанаўлівае дзяржаўныя святы і святочныя дні; узнагароджвае Прэзідэнта дзяржаўнымі ўзнагародамі, прапаноўвае асоб для ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі, а таксама ажыццяўляе іншыя канстытуцыйныя паўнамоцтвы. Варта адзначыць, што рашэнні УНС з'яўляюцца абавязковымі для выканання і могуць адмяняць прававыя акты, іншыя рашэнні дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў. УНС непасрэдна ўдзельнічае ў абранні найвышэйшых службовых асоб на дзяржаўныя пасады. Так, па прапанове Прэзідэнта, папярэдне ўзгодненай з яго Прэзідыумам: выбірае Старшыню, намесніка Старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда, Старшыню і суддзяў Вярхоўнага Суда, Старшыню і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі і вызваляе іх ад пасады па падставах, прадугледжаных законам.

Такім чынам, УНС з прычыны агульнаграмадзянскага калектыўнага розуму, які адлюстроўвае разнастайныя інтарэсы розных слаёў грамадства, будзе фарміраваць і выказваць агульную волю беларускага народа, непасрэдна садзейнічаць развіццю грамадзянскага грамадства, кансалідацыі яго інстытутаў у рэалізацыі найважнейшых задач і ўмацаванню асноў дзяржаўнасці.

Суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Анатоль ЦІКАВЕНКА.

На слыху

Нашы Узброеныя Сілы выконваюць задачы толькі на сваёй тэрыторыі

Аб гэтым заявіў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Віктар ГУЛЕВІЧ

Спробы дэстабілізаваць абстаноўку на фоне падзей ва Украіне працягваюцца. Праваліўшы план па лжывай мабілізацыі (на днях некаторыя грамадзяне атрымалі ліпавыя павесткі ў армію), фэйкамётчыкі, якія спекулююць на гэтай тэме, паведамілі грамадскасці аб нібыта нанесеных па нашай тэрыторыі ўдарах, а таксама аб удзеле беларускіх вайскоўцаў у ваеннай аперацыі ў суседняй дзяржаве.

Як паведаміў начальнік Генштаба, у цяперашні час у адпаведнасці з задачай, пастаўленай Галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі, пяць батальённых тактычных груп сумесна з органамі пагранічнай службы ажыццяўляюць прыкрыццё паўднёвых граніц нашай дзяржавы з мэтай недапушчэння пранікнення на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь з боку Украіны шматлікіх нацыяналістычных узброеных фарміраванняў, нелегальнай дастаўкі зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. «Дадзеныя падраздзяленні выконваюць задачы разведкі, патрулявання, аховы аб'ектаў і абароны на дарожных кірунках, — удакладніў Віктар Гулевіч. — У найбліжэйшы час плануецца ажыццявіць іх замену таксама пяццю батальённымі тактычнымі групамі. Падраздзяленні, якія выконваюць свае задачы па прыкрыцці Дзяржаўнай граніцы, вернуцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі і прыступяць да планавай штодзённай дзейнасці».

— Для дамаросных «ваенных экспертаў» і «канапных» аналітыкаў хачу падкрэсліць, што перамяшчэнне войскаў ніякім чынам не звязанае з падрыхтоўкай, а тым больш удзелам беларускіх ваеннаслужачых у спецыяльнай ваеннай аперацыі на тэрыторыі Украіны, — акцэнтаваў увагу першы намеснік міністра абароны. — Родных і блізкіх магу запэўніць, што нашы Узброеныя Сілы задачы па забеспячэнні ваеннай бяспекі Рэспублікі Беларусь выконваюць толькі на сваёй тэрыторыі.

Як заўважыў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Леанід КАСІНСКІ,** ствараецца ўстойлівае ўражанне, што ваенна-палітычнае кіраўніцтва Украіны поўнасцю страціла кантроль над абстаноўкай. «Толькі гэтым можна растлумачыць поўную няўзгодненасць у дзеяннях і падачы інфармацыі, — перакананы прадстаўнік абароннага ведамства. — Так, распаўсюджваемыя Украінай фэйкі 11 сакавіка аб нібыта нанесеных ударах Расійскай Федэрацыяй па населеных пунктах на тэрыторыі Беларусі, а таксама аб фэйкавым наступленні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у 21.00 11 сакавіка абраслі новымі падрабязнасцямі. Саветнік кіраўніка офіса прэзідэнта Украіны Аляксей Арэстовіч, каментуючы падзеі 11 сакавіка, пацвярджаючы інфармацыю ваеннага ведамства Беларусі, заявіў, што ніякіх удараў не было. Разам з тым Мінабароны Украіны на стане на 24.00 11 сакавіка заявіла, што яны былі. Такі стан спраў сведчыць аб поўнай страце кіравання і ва ўмовах ваенна-палітычнай абстаноўкі, якая складваецца, пагражае сур'ёзнымі наступствамі ў першую чаргу для простых грамадзян Украіны».

Правакацыйныя і фэйкавыя заявы кіраўніцтва Украіны, па словах Леаніда Касінскага, з'яўляюцца нічым іншым, як спробай дэстабілізацыі абстаноўкі або шырмай для прыкрыцця ўласных правакацый з боку ўкраінскіх улад.

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Злучаных Штатах цэны на бензін дасягнулі гістарычнага максімуму

У США пяты дзень запар цана на паліва б'е рэкорды. На сёння сярэдняя цана па краіне складае $4,35 за адзін галон (3,785 л), што на 59 цэнтаў больш, чым на мінулым тыдні, паведамляе тэлеканал WDHN.

Цяпер сярэднестатыстычная амерыканская сям'я траціць $65 доларaў кожны раз, калі запраўляецца бензінам, летась гэтая сума не перасягала $42.

Эксперты прагназуюць, што рост цэн на паліва прадоўжыцца, і галоўнай прычынай з'яўляецца адмова адміністрацыі Байдэна ад імпарту расійскай нафты.

Сусветны саюз стараверaў прапанаваў новы горад для штаб-кватэры ААН

Ватыкан мог бы стаць найлепшай нейтральнай пляцоўкай ААН, пра якую гаворaць у МЗС Расіі, а таксама пасрэднікам у перагаворах Расіі і Украіны, Папа Рымскі Францыск у перапісцы выказаў гатоўнасць да пасрэдніцтва, сказаў старшыня Сусветнага саюза стараверaў Леанід Севасцьянаў.

Раней у МЗС Расіі заявілі агенцтву РІА «Навіны», што Расія падтрымлівае ідэю пераносу штаб-кватэры ААН з ЗША ў нейтральную краіну, гэта зрабіла б работу арганізацыі менш палітызаванай.

«Сёння Міністэрства замежных спраў выступіла, што патрэбная новая пляцоўка для ААН. У гэтым кантэксце, думаю, прапанаваць Ватыкан разглядаць у якасці такой пляцоўкі было б вельмі актуальна. Папа Францыск з самага пачатку дыстанцыяваўся ад традыцыйнага каталіцтва ў бок мультыкультуральнай інклюзіўнасці. Такім чынам, ён таксама падрыхтаваў для гэтага глебу», — сказаў Севасцьянаў РІА «Навіны».

Барэль: Захад зрабіў шэраг памылак у адносінах з Расіяй

Захад зрабіў шэраг памылак у адносінах з Расіяй, уключаючы абяцанне Украіне аб уваходжанні ў НАТА. Аб гэтым заявіў кіраўнік дыпламатыі ЕС Жазэп Барэль, паведамляе РІА «Навіны».

«Я гатоў прызнаць, што мы зрабілі шэраг памылак і што мы страцілі магчымасць збліжэння Расіі з Захадам... Ёсць моманты, якія мы маглі зрабіць лепшымі; ёсць рэчы, якія мы прапаноўвалі і потым не маглі рэалізаваць, як, напрыклад, абяцанне, што Украіна і Грузія стануць часткай НАТА... Я лічу, што гэта памылка — рабіць абяцанні, якія не можаш рэалізаваць», — сказаў Жазэп Барэль.

Раней кіраўнік дыпламатыі ЕС заявіў, што Еўрасаюз дасягнуў мяжы сваіх магчымасцяў у тым, што датычыцца фінансавых санкцый супраць Расіі.

Заходнія краіны ў сувязі са спецаперацыяй па дэмілітарызацыі ва Украіне ўвялі новыя антырасійскія санкцыі, гарговыя з 2014 года. Як раней заявіў прэс-сакратар прэзідэнта РФ Дзмітрый Пяскоў, санкцыі Захаду вельмі сур'ёзныя, Расія рыхтавалася да іх загадзя. Ён дадаў, што па іх патрэбныя аналіз і каардынацыя ведамстваў, каб выпрацаваць меры ў адказ, якія адпавядаюць інтарэсам РФ.

Блізкая ўлада

ЖКГ, ДАРОГІ, ТРАНСПАРТ...

Кіраўнік Гродзеншчыны Уладзімір КАРАНІК узяў на кантроль пытанні, узнятыя падчас прамой тэлефоннай лініі

Званкі да старшыні аблвыканкама ў асноўным былі з абласнога цэнтра. У жыхароў аднаго з інтэрнатаў горада ўзнікла праблема з пражываннем пасля змены ўладальніка будынка. Пытанне будзе дадаткова разгледжана. Як запэўніў кіраўнік рэгіёна, ніхто не застанецца без жылля.

Фота grodnonews.by.

Новыя тэндэнцыі: колькасць зваротаў змяншаецца

Усяго падчас прамой лініі паступіла каля трох дзясяткаў званкоў. Гэта на палову менш, чым за першы квартал мінулага года.

— У апошні час назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці як пісьмовых, так і зваротаў на прамыя лініі аблвыканкама і райвыканкамаў, — адзначыў Уладзімір Каранік. — Актыўнае ўзаемадзеянне з працоўнымі калектывамі, дыялогавыя пляцоўкі, сустрэчы з актывам раёнаў, грамадскімі арганізацыямі паспрыялі таму, што насельніцтва стала атрымліваць больш інфармацыі ад органаў самакіравання. Адпала неабходнасць у многіх пытаннях, з якімі людзі раней звярталіся на прамыя лініі альбо пісьмова.

Як паведаміў старшыня аблвыканкама, структура зваротаў не мяняецца. Традыцыйна людзей хвалююць жыллёва-камунальныя пытанні, ахова здароўя, дарожна-транспартная інфраструктура. Праўда, сёння жыхары рэгіёна задаюць у асноўным пытанні інфармацыйнага характару: як рэалізаваць тое ці іншае права. Напрыклад, прагучала пытанне: якой вакцынай лепш прышчапляцца, дзе тое можна зрабіць, ці есць неабходнасць рабіць цяпер. Жыхары, як правіла, у курсе планаў ЖКГ, але хочуць угледзіць канкрэтныя дэталі. Тое ж і па дарожным будаўніцтве. У асноўным людзей цікавяць перспектывы развіцця дарожнай інфраструктуры, напрыклад тэрміны выканання рамонтаў.

Эфектыўнасць работы з насельніцтвам знаходзіцца на кантролі ўсёй вертыкалі ўлады. Вядзецца аналіз прамых ліній, іх структуры, колькасці паўторных зваротаў.

— Гэта цэлы пласт работы, якая дазваляе ацаніць даступнасць органаў дзяржкіравання для нашых грамадзян, наколькі аператыўна і якасна вырашаюцца іх пытанні на месцах, наколькі эфектыўная тая ці іншая форма ўзаемадзеяння. Мы ўдасканальваем работу, пашыраем прысутнасць у сацыяльных сетках. У выніку значна знізілася колькасць зваротаў, у тым ліку паўторных скаргаў. Гэта сведчыць аб даступнасці дыялогу з органамі ўлады, які перайшоў на якасна новы ўзровень узаемадзеяння, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

Калі запрацуе Румлёўскі мост?

У ходзе прамой лініі было ўзнята пытанне адносна рамонту мастоў. Губернатар паабяцаў, што ў Гродне масты праз Нёман будуць прыведзены ў належны стан. Цяпер вядуцца рамонтныя работы ў дачыненні да Румлёўскага моста, якія павінны завяршыцца ў чэрвені. Пасля таго як там будзе наладжаны рух, пачнецца рэканструкцыя моста па вуліцы Паповіча.

Як заўважыў Уладзімір Каранік, заняцца мастамі ў горадзе стала магчыма пасля таго, як мінулым летам быў уведзены ў эксплуатацыю Усходні мост, які стаў часткай вялікага транспартнага кола вакол Гродна. Такім чынам, цяпер транспартныя патокі часткова перанакіраваныя менавіта на гэты мост.

Праектные работы па Румлёўскім месце праведзены, літаральна днямі выдадзены тэхнічныя рашэнні на ўзмацненне канструкцый з заменай пралётаў. Усе праведзеныя тут работы дазволяць эксплуатаваць пуцепровад не адно дзесяцігоддзе без рамонтаў.

— Мост на вуліцы Паповіча ўключаны ў абласную інвестыцыйную праграму, выдаткавана фінансаванне. Цяпер па ім правядзяцца праектныя работы. І тут мы ўжо вядзём гаворку аб карэннай рэканструкцыі. Гэта будзе больш працяглы працэс з поўным перакрываннем руху, — паведаміў кіраўнік рэгіёна.

Мяркуецца, што да пачатку рэканструкцыі моста па вуліцы Паповіча ў належны стан будуць прыведзены ўсе іншыя масты горада.

Падрыхтоўка да пасяўной

Уладзімір Каранік расказаў, што вясновыя работы ў сельскай мясцовасці вядуцца ў планавым рэжыме. У параўнанні з мінулым годам узраслі тэмпы як па назапашванні ўгнаенняў, так і па рамонце тэхнікі. Арганізацыям, якія займаюцца рамонтам сельгастэхнікі, выдзелены льготныя крэдыты на закупку запчастак. Хапае пад поўную патрэбу і насення. Паліва дастаткова ва ўсіх сельгасарганізацыях. Старт работ будзе залежаць ад надвор'я. Па словах кіраўніка рэгіёна, робіцца ўсё магчымае для стабільнай работы аграпрамысловага комплексу.

— Развітая сельская гаспадарка вобласці дазваляе значную частку прадукцыі адправіць на экспарт. Выбудоўваецца новы лагістычны ланцужок. Разам з тым наша задача — у першую чаргу забяспечыць даступным харчаваннем беларусаў, прыняць меры, каб сацыяльна неабароненыя пласты насельніцтва ў поўнай ступені маглі задавальняць свае патрэбы, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Круглы стол

«У ГАЛІНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ МЫ ПАВІННЫ СПРАЦАВАЦЬ ПРОСТА БЕЗДАКОРНА»

Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН сустрэўся з ветэранамі вайны ў Афганістане ў Мар'інай Горцы. У рамках мерапрыемства адбыўся круглы стол.

— Фармат, які прадугледзелі, думаю, цікавы для ўсіх прысутных, — звярнуўся да ўдзельнікаў мерапрыемства губернатар. — Традыцыйна хацелася б пагаварыць аб сітуацыі, што склалася ў свеце, праблемах, якія вас хвалююць, пачуць прапановы. Час сёння нялёгкі: падзеі ва Украіне, санкцыйная палітыка супраць нашай краіны. Я ўпэўнены, што гэта толькі нагода. На маю думку, ідзе перафарматаванне свету. Гэта супрацьстаянне не Расіі і Украіны, а Расіі і Захаду. Крызісныя з'явы выклікаюць пэўныя цяжкасці, але і адкрываюць вокны для новых магчымасцяў, перш за ўсё ў эканоміцы. Нам адкрыты вялікія рынкі Расіі, Кітая, рэспублік Сярэдняй Азіі. Наша прадукцыя запатрабавана, і сітуацыя падштурхне нас да таго, каб яшчэ раз уважліва паглядзець на пытанні імпартазамяшчэння. Кіраўнік дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў, што мы можам быць самадастатковымі і мінімізаваць залежнасць ад іншых краін.

Што датычыцца спецаперацыі Расіі ва Украіне, то Аляксандр Турчын падкрэсліў: Прэзідэнт Беларусі неаднаразова даваў адказы на гэты конт. Мы будзем заваць толькі ў тым выпадку, каб абараняць сваю зямлю.

Спыніўся старшыня Мінаблвыканкама і на эканамічных пытаннях. Так, тут ёсць некаторыя праблемы, але, нягледзячы на пэўныя складанасці, эканоміка Мінскай вобласці развіваецца.

— Не толькі, напэўна, зброя адыгрывае сваю ролю ў сучасным свеце. Энергетыка — таксама «зброя». Для Беларусі тысяча кубаметраў газу каштуе 128,5 долара. Краіна спажывае каля 20 мільярдаў кубоў за год. Можна шляхам няхітрых разлікаў падсумаваць, што нават пры цане 900—1000 долараў за тысячу кубоў газу, якія сёння Расія па доўгатэрміновых кантрактах пастаўляе ў Еўропу, нам неабходна 20 мільярдаў долараў. І тых трох мільярдаў, якія нібыта выдзяляць збеглым на дэмакратычныя ператварэнні, не хопіць і на чатыры месяцы, каб разлічыцца за газ.

> Спыніўся Аляксандр Турчын і на пастаўках айчыннай прадукцыі за мяжу, харчовай бяспецы. Практычна 50 % прадукцыі Беларусь экспартуе, столькі ж яе спажываецца ў краіне. «Што датычыцца забеспячэння айчыннага рынку, то тут не бачу ніякіх праблем. Пры любой сітуацыі мы можам гэтыя патокі накіраваць унутр Беларусі».

Звярнуў увагу Аляксандр Турчын на тое, што значна паднялися цэны на азотныя ўгнаенні. Гэта паўплывала на кошт харчовай пшаніцы, якая падаражала на 70 %. На біржавых таргах цэны дасягаюць 500—600 долараў. У сваю чаргу павялічваецца і цана на прадукцыю жывёлагадоўлі. Гэтыя працэсы толькі набіраюць сілу. Не можа ў такой сітуацыі быць пераможцы, пацерпяць усе, лічыць Аляксандр Турчын.

— Для нашых аграрыяў найважнейшым фактарам харчовай бяспекі з'яўляецца правядзенне якасных вясенніх палявых работ. Нам трэба атрымаць збожжа для таго, каб забяспечыць людзей і жывёлагадоўлю. Сёння, на мой погляд, мы знаходзімся ў добрых канкурэнтных адносінах. Угнаенні атрымліваем па нашых цэнах: і калій, і азот, і фосфар. Яны вельмі канкурэнтаздольныя на кошце з той жа Заходняй Еўропай. У галіне сельскай гаспадаркі мы павінны спрацаваць проста бездакорна. Паўтару яшчэ раз: для нас адкрыты бязмежныя рынкі Кітайскай Народнай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі. Таму праблем з пастаўкай прадукцыі не бачу, — выказаў меркаванне Аляксандр Турчын.

Канешне, не ўсё так бязвоблачна, дадаў ён. Існуе праблема ў разліках. Аднак, на яго погляд, лагістычныя ланцужкі, фінансавыя патокі будуць наладжвацца. Прыйдзе час разлікаў у юанях. Усё ў свеце мяняецца. Фарміруюцца новыя велізарныя рынкі — Індыя, Кітай, Расія, Казахстан, Узбекістан.

— Вы сустракаецеся з моладдзю, бываеце ў працоўных калектывах, — звярнуўся кіраўнік цэнтральнага рэгіёна да воінаў-інтэрнацыяналістаў. — Ва ўсім свеце на першы план выходзяць інфармацыйная вайна, прапаганда. Не кожны чалавек здольны прааналізаваць тую ці іншую сітуацыю, зрабіць правільныя вывады. Мы прывыклі, асабліва маладое пакаленне, жыць у інтэрнэце, тэлеграм-каналах. І па загалоўках рабіць высновы. Вас, людзей, якія маюць вялікі жыццёвы вопыт, якія, упэўнены, могуць цвяроза аналізаваць і крытычна ацэньваць тую ці іншую інфармацыю, хачу папрасіць пры сустрэчах з людзьмі даносіць аб'ектыўную пазіцыю, расказваць пра сітуацыю, якая ёсць на самай справе.

Аляксандр Турчын распавёў прысутным аб узвядзенні новага будынка музея ў мемарыяльным комплексе «Хатынь», экспазіцыя якога дазволіць убачыць на свае вочы тыя звярствы, жахі, якія здзяйсняліся фашыстамі на нашай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Падчас Паслання Прэзідэнта Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь была выказана ініцыятыва зрабіць Хатынь маладзёжнай будоўляй. На гэты конт ёсць адпаведны пратакол даручэнняў кіраўніка дзяржавы. На думку Аляксандра Турчына, удзел моладзі ў стварэнні такога аб'екта вельмі важны, паколькі ўмацоўвае сувязь пакаленняў.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна таксама паведаміў, што шпіталь для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П. М. Машэрава ў Бараўлянах з рэспубліканскай уласнасці перайшоў у абласную па распараджэнні Прэзідэнта. У гэтай медыцынскай установе лячыліся ў тым ліку і воіны-інтэрнацыяналісты. Аляксандр Турчын запэўніў, што тут нічога не зменіцца, захаваюцца месцы, ранейшыя ўмовы, для таго каб людзі, якія прайшлі войны, змаглі атрымліваць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу.

Старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый Гайдукевіч лічыць, што сёння ў выхаванні падрастаючага пакалення самае галоўнае — прывіць гатоўнасць абараняць Радзіму.

Старшыня Слуцкай раённай арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Аляксандр Курловіч адзначыў, што і на слуцкай зямлі ёсць свая Хатынь. Гэта вёска Пераходы, якую спалілі фашысты. На гэтым месцы 50 гадоў таму ўладкавалі помнік у гонар загінулых. З цягам часу ён страціў першапачатковы выгляд. Аб'яўлены збор сродкаў на яго рэканструкцыю. Але да помніка складана дабрацца, дарога патрабуе рамонту. Непадалёку размешчаны санаторый, дзе адпачываюць дзеці. Нядрэнна было б іх прывозіць на экскурсію. Аляксандр Курловіч перадаў старшыні Мінаблвыканкама дакументы па гэтым помніку.

«Трэба азнаёміцца, які аб'ём работ неабходна выканаць. І вызначыцца, што можна зрабіць з дарогай. Думаю, гэтую праблему вырашым», — пракаментаваў Аляксандр Турчын.

Удзельнікі мерапрыемства прапанавалі аб'яднаць ветэранскую арганізацыю і саюз воінаў-інтэрнацыяналістаў.

Гэтае пытанне можна будзе абмеркаваць на ўзроўні Прэзідэнта, падтрымаў ідэю Аляксандр Турчын.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Па-суседску

ГАРАНТЫЮ СПАКОЮ ШУКАЮЦЬ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Гомельскі, Мазырскі і Брагінскі раёны паўднёвага ўсходу краіны — рэгіёны, дзе прымаюць, аказваюць усю неабходную гуманітарную дапамогу і даюць часовае жыллё вымушаным мігрантам з Украіны. Шукаюць ратавання на Гомельшчыне бежанцы цэлымі сем'ямі, з дзецьмі і старымі.

Дзвесце дваццаць кіламетраў, што аддзяляе родны ўкраінскі Гастомель ад беларускага Мазыра, пераадолела сям'я Пячонкіных. Адразу пасля пачатку ваенных дзеянняў у іх вобласці бацькі з васьмімесячным дзіцем на руках вырашылі, што нічога больш не застаецца, як прарывацца на тэрыторыю Беларусі. Аб тым, як далася гэта жудасная «дарога з дому», журналістам расказаў малады бацька і муж Міхаіл Пячонкін:

— Мы на машыны наляпілі надпісы «Дзеці». Белыя анучы — у вокны, на антэнах, усюды, — узгадвае ён. — Дарога была доўгая, ехалі павольна, таму што глядзелі па баках: маглі трапіць куды заўгодна. На Мазыршчыне, на найбліжэйшай запраўцы, нам ужо дапамаглі. Толькі ўбачылі ўкраінскія нумары на машыне, падышлі і адразу: «Чым дапамагчы?»

Сёння ў сям'і асобны пакой у адным з інтэрнатаў Мазыра. Побач, у суседніх «кватэрах», — такія ж вымушаныя ўцекачы з Украіны. Усе пакуль не бяруцца загадваць, што далей.

Між тым, як вядома, з 24 лютага на Гомельшчыну праз пагранічныя пункты пропуску прыбыло каля 680 вымушаных бежанцаў з Украіны. Забеспячэнне парадку, максімальна хуткае і камфортнае перасячэнне граніцы грамадзянамі суседняй краіны — заслуга высокапрафесійнай работы супрацоўнікаў Гомельскай пагранічнай групы. У сваю чаргу, праваахоўнікі вобласці робяць усё магчымае, каб у прыгранічных раёнах забяспечыць спакойную абстаноўку і жыццё грамадзян у звыклым рытме.

На гэтым на апаратнай нарадзе ў Гомельскім аблвыканкамэ засяродзіў увагу кіраўнік рэгіёна Іван Крупко. Старшыня аблвыканкама падкрэсліў, што пазіцыя ў адносінах да ўкраінцаў, якія прыбываюць, адназначная і яе дакладна акрэсліў Прэзідэнт нашай краіны: беларусы гатовы і ўжо аказваюць усямерную дапамогу кожнаму.

Гомельшчына, як падкрэсліў Іван Крупко, выпрацоўвае максімальна зручныя варыянты канкрэтных крокаў па рабоце з бежанцамі. Усе службы працуюць у строгім узаемадзеянні. Асобная падзяка кіраўніцтва рэгіёна — валанцёрам Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, якія гатовы ў любы час сутак прыйсці на дапамогу вымушаным мігрантам.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО наведаў пункт пропуску на беларуска-ўкраінскай граніцы і панаіраў за работай пункта абаграванння Беларускага Чырвонага Крыжа для грамадзян, якія прыбываюць з Украіны. Імправізаваны мабільны «гуманітарны лагер» размешчаны ў вёсцы Гдзень Брагінскага раёна. Губернатар пагутарыў з валанцёрамі і вымушанымі бежанцамі.

— Змена па 12 гадзін, але фактычна застаёмся на суткі. Ёсць і такія, хто з чацвярга на вахце, — расказалі аб сваёй рабоце на граніцы валанцёры Беларускага Чырвонага Крыжа. — Цяжкасцяў не баімся, а вось дапамога патрэбна.

Валанцёраць у пункце абагравання для ўкраінцаў Беларускага Чырвонага Крыжа ў Брагінскім раёне многія жыхары Гомеля. На асноўнай рабоце, тлумачаць, пішуць заявы на выхадны за свой кошт. Колькі яшчэ пункт дапамогі будзе працаваць, невядома, а валанцёры ад дзяжурстваў не адмовяцца.

Іван Крупко звярнуўся да кіраўнікоў прадпрыемстваў, чые работнікі заступаюць на вахту ў пунктах дапамогі Чырвонага Крыжа на пагранпераходах. Губернатар заклікаў падтрымаць валанцёраў у іх высакароднай справе і знайсці спосаб захаваць заробак па асноўным месцы працы, пакуль яны дапамагаюць бежанцам на граніцы.

— У лёсе ўкраінцаў, якія прыбываюць, прымае ўдзел кожны наш жыхар, — адзначыў Іван Крупко. — Людзі прыбываюць, мы іх сустракаем, вызначаем, ці ідуць яны далей, ці спыняюцца ў сваякоў. Тым, каму няма дзе спыніцца, даём часовае пражыванне. Вызначаны для гэтых мэт санаторыі, гасцініцы. Практычна сёння мы можам адначасова прыняць ад 600 да тысячы чалавек, — адзначыў кіраўнік рэгіёна.

Падчас наведвання пункта пропуску на беларуска-ўкраінскай граніцы губернатар выслухаў пытанні і прапановы жыхароў прыгранічнай тэрыторыі.

— У Славуцічы палова пасёлка — беларусы. Нашы сваякі там. Святла няма, есці няма чаго. Мост узарваны. Дапамажыце хоць як-небудзь: ці туды прадукты даставіць валанцёрамі, ці сюды ім вярнуцца, — падзяліліся перажываннямі за сваіх сваякоў жыхары прыгранічча.

Іван Крупко звярнуў увагу, што ва ўсе пункты пропуску, дзе толькі можна, неабыякавыя людзі прывозяць гуманітарную дапамогу: прадукты, ваду, гігіенічныя прылады. Перададзена ўжо каля 300 такіх грузаў.

— Сітуацыя нестандартная, таму па вазе (гуманітарную дапамогу. — **Заўв.**) не абмяжоўваем. Галоўнае, каб нехта з таго боку падышоў і забраў гэтую дапамогу. Бо дапамагчы на тэрыторыі Украіны мы не можам. Валанцёраў адпраўіць таксама не можам. Мы нясём адказнасць за жыццё нашых людзей. Што датычыцца вяртання ў Беларусь — толькі па гуманітарных калідорах, дзе бяспеку забяспечваюць расійскія вайскоўцы, — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна.

Звярнуліся з пытаннямі да губернатара і грамадзяне Украіны, якія пасля перасячэння граніцы знаходзіліся ў пункце абагравання Беларускага Чырвонага Крыжа, чакалі афармлення дакументаў. Многія просьбы датычыліся здароўя. Гэтыя пытанні Іван Крупко ўзяў на асабісты кантроль, даў даручэнні адпаведным службам.

— Напалоханыя фэйкавай інфармацыяй украінцы з асцярогай едуць у Беларусь, бо ў Беларусі, як вяшчаюць у іх СМІ, таксама страляюць. Таму купал Чырвонага Крыжа на граніцы для гэтых людзей — знак міру і гарантыя спакою, — асабліва падкрэсліла **сенатар, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі БТЧК Ала СМАЛЯК.**

Між тым на Гомельшчыне адказныя органы па сацыяльнай абароне і працы вывучаюць запыты аб працаўладкаванні вымушаных мігрантаў. Улічваюцца іх прафесіі і кваліфікацыі. У абласным банку вакансій ужо ёсць 12 тысяч прапаноў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМІ ПЕРАЕМНІКАМІ ВЕТЭРАНАЎ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Месца для мерапрыемства было выбрана невыпадковае. Ужо ў першы дзень фашысцкай агрэсіі супрацьсавецкай дзяржавы супрацоўнікі лінейнага аддзела міліцыі станцыі «Брэст» праявілі мужнасць і гераізм. І калі пра абаронцаў крэпасці ведае ці не ўвесь свет, ім прысвечаны кнігі, фільмы, музейныя экспазіцыі, то пра міліцыянераў, што стаялі на сваёй зямлі да апошняй кроплі крыві, вядома значна менш. А гэтых людзей варта помніць.

— Мы памятаем усіх нашых супрацоўнікаў, хто загінуў за Радзіму, шануем іх памяць. І гэтая памяць святая. Мы сёння прыехалі ў Брэст з сем'ямі, будучымі супрацоўнікамі ўнутраных спраў. У нашай краіне шмат міліцэйскіх дынастый. І мы заўсёды будзем памятаць апошнія словы лейтэнанта Вараб'ёва, сказаныя сыну: «Будзь героем», — сказаў **міністр унутраных спраў Беларусі Іван КУБРАКОЎ.**

22 чэрвеня, у першыя мінуты вайны, міліцыянеры Брэсцкага чыгуначнага вакзала былі паднятыя па трывозе і прыбылі на свае рабочыя месцы. Вакзал нагадваў мурашнік, было поўна народу, людзі з чамаданамі, валізкамі, дзецьмі спрабавалі трапіць на апошнія цягнікі па ўсходнім кірунку. Сярод пасажыраў пачалася паніка. Начальнік лінейнага аддзела міліцыі Андрэй Вараб'ёў накіроўваў міліцыянераў на перон для падтрымання парадку, потым загадаў сабрать усе магчымыя боепрыпасы і заняць абарону. Але сілы былі няроўныя. Абаронцаў узялі ў кола, змусіўшы іх спусціцца ў падвалы. Немцы шмат разоў прапаноўвалі здацца, пры гэтым звярталіся да камандзіраў і байцоў Чырвонай Арміі. Яны і не падазравалі, што супраць іх стаяць звычайныя міліцыянеры, узброеныя табельнай ды канфіскаванай зброяй. Калі захопнікі не дабіліся жаданага, яны пачалі затоплівать падвалы вадой, закідваць гранатамі. Чатыры дні пратрымаліся мужныя абаронцы вакзала ў невыносных умовах і амаль усе загінулі.

У гонар тых падзей на будынку вакзала ўстанавілі мемарыяльную дошку. А спачатку адбылася рэканструкцыя дня 22 чэрвеня. У зале чакання вакзала сядзелі і стаялі пасажыры ў адзенні 1940-х гадоў, буфеты падавалі чай з самавараў і абаранкі. Мінулае ажывала на вачах. Потым завылі сірэны, забегалі людзі з багажом, паявіліся захопнікі ў нямецкай форме — на матацыклах, з аўтаматамі. На Прывакзальнай плошчы рэканструктары першыя эпізоды абароны разыгралі па мінутах. Чыгуначнікі і міліцыянеры паспелі адправіць састаў на Баранавічы і ўзялася за вінтоўкі ды пісталеты. Пачалася страляніна, людзі падалі, скошаныя кулямі...

Як сказаў **кіраўнік ваенна-гістарычнага аб'яднання «Гонар мундзіра» Уладзімір КОЛАТ,** гэта другі выпадак у гісторыі, калі рэканструктары аднаўляюць мініяцюры ў рэальнай абстаноўцы і ў форме міліцыянераў пачатку 1940-х гадоў. Была задзейнічана гістарычная тэхніка, а рэканструктары прыехалі ў Брэст з усёй Беларусі.

Акрамя ўдзельнікаў імпрэзы, якіх было больш за тысячу, з боку перона за дзеяй назіралі пасажыры вакзала, многія былі з дзецьмі. І як пачуліся стрэлы, выбухі, некаторыя дзеці спалохаліся, пачалі плакаць, бацькі тэрмінова адводзілі іх далей, засланялі сабой. І тады асабліва адчувалася, якая страшная вайна і як важна захоўваць мір і спакой.

Пра важнасць забеспячэння спакойнай мірнай працы гаварыў у сваім прывітальным слове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** Губернатар падкрэсліў знакавасць мерапрыемства на брэсцкай зямлі, якое, па сутнасці, адкрывае шэраг падзей рэспубліканскага маштабу, прысвечаных Году гістарычнай памяці.

У гэты ж дзень урачыста адкрылі абноўлены музей брэсцкай міліцыі. Музей стварылі ў 2007 годзе да 90-годдзя беларускай міліцыі. Прыйшоў час абнавіць экспазіцыю, пашырыць яе, зрабіць больш сучаснай, што і было зроблена за мінулы год. У выніку змяніліся ўсе чатыры залы музея, якія расказваюць пра станаўленне брэсцкай міліцыі, перыяд Вялікай Айчыннай вайны, барацьбу з бандфарміраваннямі ў пасляваенныя гады, работу міліцыі да нашых дзён.

Мерапрыемствы працягваліся ў Брэсцкай крэпасці. Кіраўнікі Брэсцкай вобласці, абласнога цэнтра, кіраўніцтва МУС, дэлегацыі ўсіх абласцей і Мінска ўсклалі вянкі да Вечнага агню. На плошчы Цырыманіялаў сабраліся ветэраны ўнутраных спраў, сем'і міліцыянераў, прадстаўнікі грамадскасці. Віртуальныя віншаванні беларускім калегам перадалі кіраўнікі праваахоўных ведамстваў Расіі, Кыргызстана, Арменіі, Азербайджана.

Адбыўся вялікі канцэрт-рэквіем. Пачаўся ён са звароту Прэзідэнта, які транслявалі з вялікага экрана каля галоўнага манумента Цытадэлі.

— Паважаныя супрацоўнікі міліцыі, дарагія ветэраны! Вы прысвяцілі сябе пачэснай місіі — абараняць закон і парадак, берагчы спакой і сон мірных грамадзян, — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу на тое, што беларускую зямлю і каштоўнасці не раз выпрабоўвалі на трываласць, а сёння ў краіне прыгожыя, дагледжаныя вуліцы, людзі ідуць і едуць на работу, гуляюць з дзецьмі, займаюцца спортам — іншымі словамі, жывуць з пачуццём упэўненасці ва ўласнай бяспецы.

Прэзідэнт падзякаваў тым, хто стаяў каля вытокаў стварэння нашай міліцыі, хто супрацьстаяў злачыннасці ў цяжкі паслярэвалюцыйны час і гады Вялікай Айчыннай вайны, хто з гонарам выканаў інтэрнацыянальны абавязак у 1980-я гады і бясстрашна вёў барацьбу з крыміналітэтам у 1990-я.

— І сёння, што б ні здаралася, кожны з вас ад радавога да генерала, сумленна і прафесіянальна выконвае сваю работу, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я ганаруся кожным міліцыянерам: патрульным, участковым, операм, кожнай службай і кожным кіраўніком. Ведаю, у любое надвор'е і пры любых умовах вы гатовыя закрыць сваімі грудзьмі мірных грамадзян ад любой пагрозы. Вы смелыя і адважныя людзі. А галоўнае — дастойныя пераемнікі нашых шаноўных ветэранаў.

Асобна Прэзідэнт падзякаваў бацькам, родным і блізкім супрацоўнікаў міліцыі за тое, што падтрымліваюць, суперажываюць сваім родным, такім чынам даючы ім сілы, і адрасаваў ім самыя цёплыя пажаданні.

Хвілінай маўчання ўшанавалі ўдзельнікі мерапрыемстваў памяць тых, хто загінуў у гады вайны за наша сённяшняе мірнае жыццё. На экране прабягалі кадры ваеннай фотахронікі, імёны і прозвішчы тых, хто загінуў у ваенны, а затым і ў мірны час пры выкананні службовых абавязкаў. Гучалі патрыятычныя песні. Скончыўся канцэрт-рэквіем акцыяй «Спяём гімн разам».

Ураганнымі пра мерапрыемства з карэспандэнтам падзялілася **дачка ўдзельніка вайны, кіраўніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў у 1960—1970-я гады Валерыя Асташонка Лілія АСТАШОНАК:**

— Мне вельмі прыемна, што цяперашнія супрацоўнікі міліцыі памятаюць сваіх папярэднікаў, аддаюць ім даніну павагі. У кожнай вобласці, кожным раёне былі міліцыянеры, якія з пачатку вайны сталі на абарону Радзімы і выканалі свой абавязак, вельмі часта — цаной жыцця. Гэтыя нябачныя сувязі, пераемнасць пакаленняў вельмі важныя сёння.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Упакоўка

БІЯРАСКЛАДАЛЬНАЯ ЗАМЕСТ ПЛАСТЫКАВАЙ

Кардонны посуд, драўляныя відэльцы, трысняговыя саломінкі выратуюць свет?

Штогод у свеце ўтвараецца каля 300 млн тон пластыкавых адходаў, палова з якіх — пластыкавая ўпакоўка. Уклад беларусаў у гэты аб'ём — да 150 тысяч «пластыкавых» тон вытворчасці, з якіх перапрацоўваецца да 90 %. Пры гэтым у свеце працягваецца ўжыванне тары, пакетаў і аднаразовага посуду з пластмасы, што непакоіць экалагаў. Як зрабіць упакоўку больш экалагічнай і бяспечнай для наваколля, што робіцца для ўтылізацыі і перапрацоўкі пластыкавага смецця і чым можна замяніць пластык ды пенапласт, расказалі эксперты.

Эканамічны стымул і абмежаванні на выкарыстанне

Каб павысіць экалагічную бяспечнасць упакоўкі, трэба адмовіцца ад экалагічна небяспечнай, найперш пластыкавай, і замяніць яе экабяспечнай, у тым ліку біяраскладальнай, упэўнены **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды.** Ён нагадаў, што пластык можа раскладацца да тысячы гадоў, у выніку чаго ў асяроддзе выдзяляецца мноства забруджвальных рэчываў. А мікрапластыкавыя частачкі могуць убудоўвацца ў харчовы ланцужок і трапляць у арганізм чалавека.

— У складзе цвёрдых камунальных адходаў у нашай краіне штогод ствараецца каля 280 тон пластыку, з якіх для далейшага выкарыстання бярэцца 35-37 %. Адмова ад пластыкавай упакоўкі — сусветная тэндэнцыя, і асаблівая ўвага міжнароднай супольнасці скіравана найперш на барацьбу з пластыкавымі пакетамі і пенапластавымі вырабамі як найбольш праблемнымі. Ужо звыш 60 краін увяло пэўныя абмежаванні і забароны на выкарыстанне аднаразовых пластыкавых вырабаў. Гэта адмова ад вырабу і выкарыстання небіяраскладальных пакетаў, увядзенне абмежаванняў на ўжыванне пакетаў пэўнай таўшчыні.

Урадам Беларусі зацверджаны план мерапрыемстваў па зніжэнні выкарыстання палімернай упакоўкі і яе замяшчэнні экалагічна бяспечнай. У яго рамках запланаваны мерапрыемствы ў галіне ўдасканалення абыходжання з адходамі і змяншэння ўжывання палімернай упакоўкі, навуковых даследаванняў, вырабу і выкарыстання экалагічна бяспечнай упакоўкі, а таксама інфармацыйна-асветніцкай работы сярод насельніцтва, абазначыў спецыяліст.

Сярод рэалізаваных планаў, дарэчы, абавязковая наяўнасць у аб'ектах гандлю безалкагольных напояў і вады ў шкляной тары, папяровых пакетаў, аднаразовага посуду і сталовых прыбораў з паперы, мінімізаваная разнастайнасць колькасці відаў пластыкавых пакетаў і посуду. У аб'ектах грамадскага харчавання забароненае ўжыванне аднаразовага пластыкавага посуду, што паспрыяла павелічэнню выпуску аднаразовага посуду з паперы і кардону. Летась наладзілі выраб відэльцаў, нажоў, трубачак для напояў з дрэва.

Эканамічным стымулам да пераходу ад пластыкавай упакоўкі да экабяспечнай стала зніжэнне ўдвая платы, якую ўносяць пастаўшчыкі і вытворцы за арганізацыю збору, абясшкоджвання і выкарыстання біяраскладальнай упакоўкі. Пры гэтым удвая вышэйшай стала плата за тую ж паслугу з палімернай упакоўкай.

Прапановы і забароны ў межах ЕАЭС і Беларусі

Па ініцыятыве Беларусі ў тэхрэгламент Мытнага саюза па бяспечнасці ўпакоўкі былі прапанаваны да ўнясення чатыры змяненні. Гэта абмежаванне прымянення этыкеткі з полівінілхларыду на ўпакоўку з поліэтылентэрэфталату, выкарыстанне лёгкіх палімерных пакетаў, прымяненне оксіраскладальных дабавак, выкарыстанне спажывецкай упакоўкі для харчовай прадукцыі з успененага полістыролу.

Аднак пакуль была падтрымана толькі адна ініцыятыва — забарона выкарыстання ПВХ-этыкеткі на ПЭТ-упакоўцы (аднак яна яшчэ не ўвайшла ў сілу). Астатнія палажэнні будуць разглядацца ў межах стратэгічных напрамкаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі. Некаторыя абмежаванні, магчыма, прымуць на нацыянальным узроўні.

— Краінамі — удзельніцамі ЕАЭС замацаваны стратэгічныя кірункі развіцця і эканамічнай інтэграцыі да 2025 года, згодна з якімі прадугледжана даследаванне пытання аб паэтапнай забароне вырабу і ўвозу ў гэтыя краіны аднаразовага пластыкавага посуду. Трэба высветліць, ці мэтазгодныя такія меры, — заўважыў Максім Тарасаў.

Каб абмежаваць увоз на мытную тэрыторыю ЕАЭС палімерных адходаў, па ініцыятыве Беларусі вядзецца работа па ўключэнні пластыкавых адходаў у пералік тавараў, адносна якіх устаноўлены дазвольны парадак увозу.

— Плануецца распрацоўка навукова-даследчай работы, якая на першым этапе мае на мэце складанне пераліку палімерных вырабаў, на другім — прагноз наступстваў ад увядзення такога абмежавання. Мы павінны разумець, якія менавіта ўпакоўка і матэрыял нясуць небяспеку, — падкрэсліла **Наталля ПАРКОЎСКАЯ, намеснік начальніка ўпраўлення тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі Дзяржкамітэта па стандартызацыі.**

Дзяржстандарт Беларусі займаецца распрацоўкай чацвёртага змянення ў пяты рэгламент, які датычыцца бяспекі ўпакоўкі. У праект унесены змяненні, датычныя тэрміналогіі: па азначэннях «утылізацыя», «біяраскладальная ўпакоўка», «перапрацоўка». Прадугледжаны дапаўненні ў частцы маркіроўкі ўпакоўкі магчымымі спосабамі: утылізацыі і перапрацоўкі. Прапануецца нанясенне знака «біяраскладальная ўпакоўка», у тым ліку калі біяраскладальнасць пацверджана вынікамі выпрабаванняў, расказала прадстаўніца Дзяржстандарта.

З 41 стандарта, якія запланаваны ў рамках праграмы распрацоўкі дзяржстандартаў, 26 ужо распрацаваны (з іх з 1 красавіка 2021-га ўведзена восем, яшчэ 18 запрацуюць сёлета з мая да верасня).

Рэінкарнацыя ўпакоўкі і эканоміка інтэлекту

Пытанне ўпакоўкі — рознабаковае і навуковае забеспячэнне павінна быць на чале вырашэння праблемы экалагічнай бяспекі. Усе пластыкі, усе ўпакоўкі ўтрымліваюць крэмніевую групу, і ўсё, што мы вырабляем для ўпакоўкі, стварае вугляродны след, на змяншэнне якога (дэкарбанізацыю) накіравана мадэль паводзін з упакоўкай нароўні з фарміраваннем «зялёнай» і цыркулярнай эканомікі, абазначыў **Валерый ГАНЧАРОЎ, дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі:**

— Ствараючы пластыкі, чалавецтва вырашала праблему захоўвання, перапрацоўкі, а таксама вырабу рэчаў, якія ў многіх выпадках выкарыстоўваць лепш, чым метал ці драўніну. Так што пэўным чынам упакоўка — цана прагрэсу. Мы вырашаем праблему, але разам з тым нарошчваем наступствы ад такога прагрэсу. Так што нам трэба знайсці рацыянальнае месца, дзе б мы, вырашаючы задачы развіцця чалавецтва, не абцяжарвалі прыроду і самога чалавека праз шэраг ускосных і непасрэдных наступстваў.

Ён таксама акрэсліў асноўныя аспекты існавання ўпакоўкі, абысціся без якіх немагчыма. Гэта, прынамсі, выраб упакоўкі, яе выкарыстанне ў тэхналагічных працэсах і як часткі тавару, а таксама для захоўвання ў быце. Падчас імпарту-экспарту тавараў таксама выкарыстоўваецца ўпакоўка для іх. Нават падчас транзіту тавараў праз тэрыторыю краіны частка ўпакоўкі застаецца ў ёй, нягледзячы на тое, што выраблена ў іншай дзяржаве. Асобны аспект — утылізацыя — пытанне, як зацыкліць рух упакоўкі ў яе наступнай рэінкарнацыі.

Выкарыстоўваючы новыя віды ўпакоўкі, нельга забывацца пра неабходнасць яе асобнага збору. Распад таго ж біяпластыку звязаны з асаблівымі ўмовамі яго збору, сарціроўкі і кампаставання. Інакш выкарыстанне традыцыйнага пластыку і біялагічнага разам прывядзе да фарміравання такога субстрату, які немагчыма будзе перапрацаваць, падкрэсліў Валерый Ганчароў.

Акадэмія навук цесна займаецца праблемамі біяраскладальнай упакоўкі Першым гульцом на гэтым полі выступаюць полілактыды, якія масава вырабляюць у ЗША і Нідэрландах, расказаў **Аляксандр РАГАЧОЎ, дырэктар Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі:**

— Наша задача дзеля плаўнага пераходу да біяраскладальнай упакоўкі — прымяняць гэтыя імпартныя матэрыялы, а з часам, магчыма, стварыць і айчынныя варыянты. Пластык — гэта не толькі палімер, але і розныя функцыянальныя дабаўкі, якія дазваляюць значна пашырыць уласцівасці тары і павысіць упаковачныя ўласцівасці матэрыялаў. Мы прымяняем розныя матэрыялы, у тым ліку айчынныя, якія ў асноўным з'яўляюцца адходамі вытворчасцяў. У прыватнасці, лігнін, які можна выкарыстоўваць як напаўняльнік.

Біяраскладальныя пластыкі і ўпакоўкі павінны ўтрымліваць у сабе кампаненты, якія будуць біяраскладальнымі, біясумяшчальнымі і біяінертнымі, то-бок не складаюць небяспекі для асяроддзя. Айчынныя хімікі распрацоўваюць тэхналогіі спалучэння цяжкасумяшчальных кампанентаў. З дапамогай дабавак яны змяншаюць кошт імпартнага аналага, а таксама надзяляюць новымі ўласцівасцямі матэрыялы, надаюць ім тлушча- і воданепранікальныя характарыстыкі.

Разам з тым існуюць нетрывіяльныя рашэнні, накшталт саломінак з трыснягу, ужыванне якіх у сістэме харчавання ўжо, дарэчы, апрабавалі ў адной са школ. А ў Лацінскай Амерыцы жывуць насякомыя, якія могуць харчавацца поліэтыленам, дадаў Валерый Ганчароў:

— Мы павінны прыйсці да канцэпцыі эканомікі інтэлекту, якая звязаная з тым, што чалавек павінен працаваць не ў рэчышчы спажывання, а ў рэчышчы разумнага стаўлення да сваіх патрэб і гарманізацыі сістэмы чалавек — прырода — грамадства. Толькі пры такім падыходзе мы зможам разумна абмежаваць спажыванне пластыкавай упакоўкі. Проста адмова ад яе верне нас у пячорны век.

Эксперты не бачаць цяжкасцяў у пераходзе вытворцаў упакоўкі на яе экалагічныя віды — было б жаданне. Вытворца можа распрацаваць тэхнічныя ўмовы, якія ў краіне праходзяць рэгістрацыю, і гэта лёгкая працэдура. Галоўнае — вытрымліваць патрабаванні тэхрэгламенту.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Надвор'е

Сакавіцкія халады

Сіноптыкі прагназуюць у чацвер анамальныя маразы — уначы да мінус 15 градусаў

Расслабляцца і прыбіраць цёплыя рэчы на далёкія паліцы пакуль яшчэ рана, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Праўда, у аўторак на нашай тэрыторыі яшчэ ў поўнай меры будзе гаспадарыць вясновае цяпло, прынамсі ўдзень. Чакаецца пераважна без ападкаў. Раніцай месцамі слабы туман, на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра днём — ад плюс 2 па паўночным усходзе да 13 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Начное паніжэнне тэмпературы месцамі пачнецца ўжо ў сераду. Будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 марозу, па паўночным усходзе пры праясненнях — да мінус 11 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — ад нуля да плюс 2 градусаў. Удзень будзе ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 10 цяпла.

І ў чацвер будзе без ападкаў. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—10 марозу, па паўночным усходзе месцамі — да мінус 11—15 градусаў. Удзень будзе ад нуля да 6 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, не чакаецца ападкаў і ў пятніцу. Тады ўначы пры чыстым небе магчымыя істотныя замаразкі. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны месцамі на дарогах магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—9 марозу, па паўночным усходзе месцамі да мінус 12 градусаў. Удзень будзе 1—8 цяпла.

У выхадныя тэмпературны рэжым зноў вернецца ў свае рэчышча і стане цяплей. У суботу пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны месцамі на дарогах магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы 2—8 марозу, удзень — 2—9 цяпла. У нядзелю працягне кіраваць надвор'ем антыцыклон. Уначы і раніцай у паўночных і паўночна-ўсходніх раёнах краіны месцамі на дарогах магчымая галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе да 7 марозу, а ўдзень — ад 3 да 10 цяпла.

І яшчэ. «Радыяцыйная абстаноўка на тэрыторыі Беларусі стабільная, магутнасць дозы гама-выпраменьвання на пунктах назіранняў радыяцыйнага маніторынгу атмасфернага паветра адпавядае шматгадовым значэнням», — гаворыцца ў паведамленні Белгідрамета.

Сяргей КУРКАЧ.

Без тэрміну даўнасці

НІКОЛІ БОЛЬШ,

або Эсфір, якая страціла ўсё...

Кожны ўспамін людзей, якія перажылі Халакост, — незагойная душэўная рана. Гэты боль людзі неслі ў сабе на працягу ўсяго жыцця. Чытаючы іх сведчанні, нібыта адчуваеш трагедыю кожнага, суперажываеш апавядальніку.

Эсфір Лявіціна нарадзілася ў шматдзетнай сям'і. Жылі цяжка і бедна. Светлая паласа для дзяўчыны наступіла, калі яна выйшла замуж. У маладых людзей нават супала прозвішча — Лявіціны. Эсфір не магла нарадавацца свайму шчасцю. Муж працаваў электрыкам у санаторыі вёскі Крынкі Старадарожскага раёна. Эсфір радавалася звычайным чалавечым дабротам: службовая кватэра, радыё, дровы, электрычнасць. Але самым галоўным яе шчасцем былі дзеці. Старэйшы сын Яша скончыў 8 класаў, Марык — 6, а дачцэ Ані было ўсяго 5 гадоў.

АШАЛЕЛА АД ГОРА

Вайна зрабіла Эсфір няшчаснай жанчынай, якая імклівa страціла ўсё. У пачатку вайны ў санаторыі пачала збірацца група падпольшчыкаў, але знайшоўся здраднік, які выдаў усіх патрыётаў. Сярод іх быў муж і старэйшы сын Яша. Гітлераўцы арыштавалі 13 чалавек. Асуджаным на смерць выдалі рыдлёўкі і прымусілі самім капаць сабе магілы.

Ашалелая ад гора маці тры дні шукала магілу родных. Яна хацела пераканацца, што яны там, хоць і мела надзею, што жывыя. Дапамагла дзяўчынка-пастушка, якая бачыла расстрэл. Яма была замаскіраваная пры дапамозе натыканых елак, якія імітуюць лес. Пад праліўным дажджом Эсфір рукамі пачала раскопваць магілу. На самым версе ляжаў яе сын, муж — на дне. Эсфір убачыла, як у сына пачалі ісці бурбалкі крыві з рота, а вусны заварушыліся, нібы хацелі нешта сказаць. Маці заплакала. Але ёй не хацелася выдаваць сваё гора, бо дома заставаліся Марык і Аня. Эсфір старалася знайсці сілы, каб жыць дзеля іх і зрабіць усё для іх выратавання. А каб дзеці не бачылі яе слёз, яна сыходзіла ў хлеў, дзе выла ад гора.

На ранейшым месцы жыхарства заставацца стала небяспечна, бо Эсфір ведала, што іх ужо шукаюць паліцаі. Толькі цудам ёй удалося пазбегнуць арышту. Дзяцей яна паспела завезці да суседа Корзуна, а сама схавалася ў кузні. Уцякала босая па марозе, суседзі прынеслі кажух і далі пад ногі сена.

ПАД АХОВАЙ ПАРТЫЗАН

Ва ўспамінах Эсфіры Лявіцінай захаваліся падрабязнасці гібелі яўрэяў Дараганаўскага сельскага Савета, калі ў адзін дзень расстралялі 40 чалавек. Адзін яўрэй схаваўся ў хляве, але яго знайшлі і расстралялі, тое ж зрабілі і з яго жонкай і дачкой.

Па дапамогу Эсфір звярнулася да Фёдара Мятліцкага, які, рызыкуючы жыццём сваім і сваёй сям'і, дапамог вывезці Лявіціну з дзецьмі ў бяспечнае месца. За выратаванне сям'і Лявіціных і іншых яўрэяў ён быў удастоены звання «Праведнік народаў свету».

Доўгі час Эсфір з дзецьмі пераходзіла з вёскі ў вёску, дзе спагадлівыя людзі дапамагалі прадуктамі, дзякуючы чаму ўдавалася хоць неяк пракарміць дзяцей. Некалькі разоў яна трапляла ў аблаву. У адзін з такіх выпадкаў Эсфір даведалася, што паліцаі прыехалі па яе, але памылкова ўзялі старую, якая паспела сказаць: «Добра, што ўзялі мяне, а то цябе б расстралялі». Жанчына разумела, што ў вёсцы яе сям'і не выжыць, бо кожную хвіліну ім пагражала смерць. Заставалася адна надзея — знайсці абарону ў партызан.

На партызанскай кухні.

Толькі ў 1943 годзе сям'і Лявіціных удалося трапіць у 100-ю партызанскую брыгаду імя Кірава Мінскай вобласці. Марык пасвіў коней, а Эсфір мыла партызанам бялізну, гатавала. Партызаны сталі называць яе Дуняй. Дачка Аня дапамагала маме на кухні.

ЖЫЦЬ ДЗЕЛЯ ДАЧКІ

Аднак злы рок працягваў праследаваць сям'ю. Ратуючыся ад бамбёжкі, Эсфір несла на плячах дачку, а сын бег побач. Пачаўся моцны бой, і маці страціла Марыка. Яна засталася ўдваіх з дачкой. Раніцай пачула стрэл і крык сына: «Вой, мамачка мая». На наступны дзень Лявіціны сустрэліся з партызанскімі сем'ямі. Жанчыны расказалі пра лёс яе сяродняга сына Марыка. Яны бачылі, як карнікі злавілі яго, але потым адпусцілі. Марык зусім не быў падобны на яўрэя: бялявы, светлыя валасы. Ён пачаў хавацца, што выклікала падазрэнне ў гітлераўцаў, яны зноў схапілі яго і на гэты раз расстралялі. Эсфір не пераставала плакаць, ёй не хацелася жыць, і ўсё ж гэта трэба было перажыць.

Яна ўсю сябе прысвячала рабоце на кухні, стараючыся як мага смачней накарміць партызан. Яе нават перавялі поварам у штаб брыгады. Аня ў свае сем гадоў дапамагала маме мыць посуд, старанна чысціла нават мёрзлую бульбу.

З вялікай падзякай Эсфір Лявіціна ўспамінала Аляксея Іванавіча Шубу — камандзіра 100-й партызанскай брыгады імя Кірава, які выратаваў многіх яўрэйскіх жанчын і дзяцей: яе саму з дачкой, жыхарку Любані Дору Кустановіч з дачкой, Гольдберга са Старых Дарог, Слуцкіна і многіх іншых. Дванаццацігадовы хлопчык Хаім прыпоўз у брыгаду на карачках. Ён не мог хадзіць, таму што адмарозіў рукі і ногі, прычым настолькі, што ад іх засталіся адны куксы. Прыняўшы Хаіма ў брыгаду, Аляксей Іванавіч загадаў добра карміць хлопчыка і даглядаць яго.

НА РОДНЫХ МАГІЛАХ

Апошнім суцяшэннем і ўцехай для маці заставалася дачка. Эсфір марыла бачыць яе жывой і шчаслівай пасля вайны. У партызанскую брыгаду часта прыляталі самалёты з «вялікай зямлі». Лявіціна папрасіла камандзіра брыгады, каб яе дачку адправілі ў Маскву разам з іншымі дзецьмі. Ані пашылі кажух, валёнкі і цалкам падрыхтавалі да дарогі. Эсфір спадзявалася толькі на адно: калі скончыцца вайна і ёй удасца выжыць, яна абавязкова адшукае дачку ў Маскве. Але гэтая надзея аказалася нязбытнай. 1 мая 1943 года партызаны, чакаючы самалёта, не заўважылі, як сямігадовы хлопчык узяў вінтоўку і нечакана стрэліў. Па фатальнай выпадковасці куля трапіла ў Аню. Дзяўчынка загінула. Так вайна забрала ў Эсфір усё.

Цяжка ўявіць, дзе знаходзіла гэтая няшчасная жанчына сілы, каб жыць, але кабе яна плакала — у брыгадзе ніхто не бачыў. Яна сыходзіла глыбока ў лес, дзе ўпотай ад усіх рыдала. Набліжалася вызваленне Беларусі. За ўдзел у партызанскім руху Эсфір Лявіціна ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» II ступені. Надышоў час вяртацца ў родныя мясціны. На развітанне Эсфір прыйшла на магілу дачкі.

У дзень вызвалення яна зведвала розныя эмоцыі:

Эсфір ЛЯВІЦІНА.

было радасна, што Беларусь зноў стала мірнай і свабоднай, але вельмі цяжка ад разумення, што побач няма ўсёй яе сям'і: дачка пахавана ў вёсцы Загалле ў Любанскім раёне, Марык — у вёсцы Казловічы Глускага раёна, а муж і старэйшы сын — каля Слуцка.

Пасля вызвалення Беларусі Эсфір Лявіціну адшукаў старэйшы брат, які паведаміў аб трагічным лёсе сям'і. Іх маці, малодшы брат і яго сям'я былі расстраляны гітлераўцамі. Ён бачыў, як адзін гітлераўец узяў маму за галаву, а другі — за ногі, а затым яе кінулі ў машыну, нібы мяшок з грузам. Сям'я старэйшага брата таксама загінула.

***

Эсфір Якаўлеўна ўладкавалася працаваць поварам у афіцэрскую сталовую. Выйшла замуж за Майсея Найбурга — чалавека з такім жа трагічным лёсам, які ў Слуцку страціў жонку і чацвярых дзяцей. Так яны маглі падтрымліваць адно аднаго.

Ва ўспамінах Эсфір Лявіцінай гучыць пранізлівы заклік: «Ніколі больш! Мы не хочам, каб заставаліся бацькі без дзяцей і дзеці без бацькоў, каб бралі жывых дзяцей і забівалі ўдарам аб вугал, каб ганялі жывых людзей на смерць і прымушалі саміх для сябе капаць ямы, як капалі мае сын і муж, і тысячы нявінных людзей».

Марыя ГАРЭЛІКАВА, вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Не казка

ПЕРСАНАЛЬНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ

— Куды гэта вас пацягнула, Сяргееўна, так рана? — апазнае ў паўзмроку суседку строгая жанчынка з партфельчыкам. — Снег во які непрыемны, мокры. Сядзелі б у хаце. «Во-во, — пачынаюць падвываць навокал, — куды пенсіянерам спяшацца».

— Ды я нікуды і не высоўвалася, — адгукаецца Сяргееўна. — Але ў паліклініку трэба.

— Рэцэпты ж можна заказаць па тэлефоне. І ўрача выклікаць.

— Трэба кроў здаць. А гэта толькі з раніцы.

Ранкам, калі надвор'е хмурнае, каля прыпынку заўсёды збіраецца больш людзей. І нават невялічкі натоўп згуртаваны адной мэтай — абавязкова ўпісацца ў першы ж транспарт, які падыдзе. Ранкам усе спяшаюцца: каму на працу, каму на вучобу, усе засяроджаныя. Ніхто не ведае, якія задачы чакаюць днём, але яны, безумоўна, вельмі важныя, калі патрабуюць вострых абцасаў і пышных фрэзураў. А дык і нездарма ж: мужчыны робяць уздых, падцягваючы свой гарбуз — і месца становіцца на пару сантыметраў больш, а гэта дае надзею праціснуцца ўнутр яшчэ некаму. Нармальна, рукі вольныя, некаторыя нават маску на твар могуць навесіць. Між іншым, як бы ні было, а ў дзверы стараюцца ўпісвацца акуратна, па галавах не хадзіць, прыгожую вопратку не пашкодзіць і не прымяць зачыненымі ўпрытых дзвярыма. Праўда, тралейбус да гэтага не заўсёды гатовы. Часам ён жартуе з людзьмі: ранкам у нас па раскладзе кантактны від спорту, ці вы не ведалі? Сутнасць такога спорту не ў тым, хто каго — яшчэ не хапала, усё ж не таго ўзроўню націск. Сутнасць у тым, каб паспець, скочыць і даехаць да месца найбольш спакойным. Пераможца атрымлівае ўсё: кампліменты калег з самай раніцы, добры настрой і ўдалы дзень на працы. А ўсё проста таму, што пашчасціла з тралейбусам (аўтобусам/трамваем). Як мала трэба для добрай раніцы...

І вось усе чакаюць, якая ж яна будзе сёння. Па-першае, не пазбаўленая надзей: чаканы тралейбус важна спыніўся, адчыніў дзверы, крыху разважліва пастаяў ды папыхцеў. Хтосьці з хударлявых хлапцоў яшчэ вырашае выпрабаваць лёс — скокнуў на прыступку і спрабуе прыціснуцца да дзяўчыны, якая знутры абурана пішчыць: «Ну, можна ж неяк больш пяшчотна...»

Усе астатнія, каму не пашчасціла на гэты раз, поўныя рашучасці ўпісацца ў наступны тралейбус. І Сяргееўна, немаладая жанчына, невялікая і амаль кругленькая з-за пухавіка, пільнуе месца, дзе павінны быць дзверы. Глыбока дыхае, гатовая да кідку наперад, а паскарэнне ёй павінен надаць кіёчак, якім яна абапіраецца на зямлю. І сапраўды! Як толькі расчыняюцца дзверы, бабуля ставіць свой кіёчак на прыступку і ўзнімае нагу. Паколькі з адваротнага боку нехта да дзвярэй надзейна прыхінуўся, яны як след не расчыніліся, і бабуля ўзняцца не змагла, каб спакойна прайсці вышэй, — адна нага так і засталася на зямлі. Але і здаць назад у Сяргееўны таксама ўжо не атрымліваецца, бо кіёчак як пуцяводная ніць Арыядны — настроены да руху ў правільным напрамку, а значыць, толькі наперад. Дастане яго — згубіць раўнавагу, а тут слізка, колы...

Тралейбус завіс: не можа вырашыць праблему адных адчыненых дзвярэй з бабуляй, якая ні туды, ні сюды. Пры гэтым за ёй людзі ўсё яшчэ не губляюць надзеі трапіць унутр...

«Ну што, пайшлі?» — пераглянуліся два маладыя хлопцы, відаць, студэнты. Замацаваўшы рамянямі заплечнікі, кінуліся да бабулі, падхапілі яе пад руку і нібыта нейкія эльфы ўзнялі яе ў паветры. «Расступіцеся, калі ласка, а то тралейбус не зрушыцца з месца, бо зачапіў чалавека». Імгненне — і бабуля стаяла на падлозе, шчыльна ўмацаваная з усіх бакоў целамі іншых пасажыраў. «Ці зручна вам, бабулечка?» — «Ой, зручна, з усіх бакоў трымаюць, не ўпаду». Але хлопцы едуць толькі да метро, паліклініка далей. Як сама — справіцца? Бабулька ў разгубленасці, — вядома, у яе так спрытна не атрымаецца. Вочы наліліся слязьмі, зараз замочаць засціраную анучку на носе, накшталт маскі. Ахоўнае кола, унутры якога ехала Сяргееўна, паспявае арганізаваць нараду па працягу аднаго прыпынку (да метро) вырашае, што трэба звярнуцца да кіроўцы, каб, пад'язджаючы да паліклінікі, папрасіў пасажыраў дапамагчы выйсці немаладой жанчыне з кіёчкам. Прапанову сталі перадаваць далей — нібыта гэта дзіцячая гульня ў тэлефон.

«Я там выходжу», — спыніў ланцужок мужчына ў самай глыбіні тралейбуса. «Яшчэ думаў: ну навошта мне тую кроў здаваць, калі добра сябе адчуваю? А яно во як атрымліваецца...»

Ён падышоў бліжэй: «Не хвалюйся, маці...»

Каля метро тралейбус выдыхнуў. І Сяргееўна змагла заняць амаль каралеўскае крэсла. Персанальная ахова трымалася побач.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Кампетэнтна

ДЭФІЦЫТУ НЕ БУДЗЕ ДАКЛАДНА

У Беларусі няма неабходнасці запасацца таварамі, бо дзяржава не дапусціць вакханаліі з цэнамі. Пра гэта заявіў міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ у эфіры тэлеканала АНТ. Кіраўнік ведамства адказаў на самыя актуальныя пытанні, якія хвалююць людзей.

— Што дакладна не знікне з магазінаў?

— Ніякіх наогул прычын для боязі і неабходнасці запасацца таварамі няма абсалютна. Растлумачу чаму: па-першае, Беларусь — найбуйнейшы вытворца харчовай прадукцыі на постсавецкай прасторы. Больш за тое, дзякуючы разумнай, узважанай палітыцы кіраўніка дзяржавы, мы ўжо даўно забяспечылі харчовую бяспеку нашай краіны і з'яўляемся найбуйнейшым экспарцёрам прадуктаў харчавання на постсавецкай прасторы. Мы самі спажылі летась 50 тыс. тон сыроў. Пры гэтым экспартавалі амаль 300 тыс. тон. У колькі гэта больш? У шэсць разоў! Усё гэта можна перанакіраваць, у выпадку неабходнасці, на наш унутраны рынак. Мы жалезабетонна забяспечаны практычна ўсімі таварамі, якія неабходныя нашым грамадзянам для камфортнага жыцця.

— Цэны растуць на пшаніцу, на асноўныя прадукты харчавання ў свеце. І Беларусь гэтая турбулентнасць не абміне бокам?

— Мы не можам кіраваць знешнімі фактарамі, якія ўплываюць на рост цэн. Але ў Беларусі мы маем вельмі шмат інструментаў, якія дазваляюць кантраляваць інфляцыю і, у прынцыпе, кіраваць цэнаўтварэннем. Ну, напрыклад, наша міністэрства рэгулюе цэнаўтварэнне на сацыяльна значныя тавары. Для вытворцаў абмяжоўваюць узровень гранічнай рэнтабельнасці (10 %). Яркі прыклад станоўчага дзяржаўна-прыватнага партнёрства — гэта калі мы дамовіліся з гандлёвымі арганізацыямі, а гэта 17 буйных сетак, аб тым, што яны будуць прадастаўляць для сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва спецыяльную скідку ў памеры 10 %.

— Ці варта цяпер купляць прадукты у запас?

— Абсалютна не варта. Гэта мы ўсе праходзілі неаднаразова. І ў 2009-м, і ў 2011-м, і ў 2014 годзе. Людзі набіраюць, а потым гэта ўсё гніе. Ці бягуць купляць бытавую тэхніку, а потым нясуць назад і плачуцца, маўляў, забярыце ў мяне два тэлевізары назад, таму што мне няма куды іх падзець.

— Што з цэнамі? І на тое, што вырабляем самі, і на тое, што закупляем за мяжой?

— На імпартныя тавары сёння, на жаль, уплыў аказвае курсавая розніца, якую мы сёння назіраем. Плюс пагоршыліся ўмовы лагістыкі. Таму мы рэгуляваць іх жорстка не маем намеру, і гэтага не робім. Дзяржава не ізаляваная ад сусветнай эканомікі, яна на нас таксама ўплывае. Але ў таварах, якія мы вырабляем самі, у найшырэйшым асартыменце, там, вядома, таксама ёсць складнік імпартнай сыравіны і курсавая розніца таксама ўплывае. Тут мы выпрацоўваем пэўныя падыходы, дзяржава не дапусціць вакханаліі з цэнамі на ўнутраным рынку. Асабліва ў харчовым сегменце.

ПЫТАННЕ ПАД'ЯДАННЯ

Як без шкоды для здароўя памяняць рацыён

Калі перавесці ў практычнае рэчышча апасенні карыстальнікаў сацсетак, што многім у будучым давядзецца быць больш ашчаднымі купляючы прадукты, то самы час авалодаць навукай татальнай эканоміі. Як карміць сябе максімальна бюджэтна, і пры гэтым па магчымасці не нашкодзіць здароўю, мы вырашылі спытаць у эксперта.

Валерый ЕРАНКЕВІЧ — шэф-кухар сацыяльнай сталовай, якая існуе на ахвяраванні. То-бок гэта чалавек, які ўмее пры наяўнасці мінімуму прадуктаў смачна і сытна накарміць максімальную колькасць чалавек. З ім мы размаўляем пра тое, як скараціць выдаткі на харчаванне і пры гэтым не адчуваць сябе вымушаным аскетам. Не будзем паўтараць надакучлівыя парады, што тавар з ніжніх паліц таннейшы, што лепш харчавацца дома, а на работу браць ссабойку. Паспрабуем даведацца аб нечым новым у чалавека, які мог бы напісаць кнігу пра мастацтва эканоміць на ежы.

ПРАВІЛА ПЕРШАЕ.

Забудзьцеся пра ранейшыя звычкі

Сваю валанцёрскую кар'еру Валерый Еранкевіч пачынаў у «ліхія дзевяностыя», калі віртуозна эканоміць на ежы ўмеў практычна кожны постсавецкі чалавек, ад студэнта да пенсіянера. З тых часоў мы паступова прывыклі да правільнай думкі, што кулінарыя — гэта высокае мастацтва. Тое, што мы ядзім, павінна сілкаваць не толькі цела, але і эстэтычныя пачуцці, пісалі ў часопісах і блогах, казалі вядомыя кухары і дыетолагі. Але ў няпросты час пра гэта лепш забыцца: падыходы даводзіцца памяняць. Думаем аб бялках, тлушчах і вугляводах у штодзённым рацыёне, а атрыманыя яны з вытанчанага сыру з цвіллю або курыных страўнічкаў — гэтую дылему пакінем да лепшых часоў. Прадукты павінны быць свежымі і якаснымі, а іх цану, месца пакупкі і сервіроўку пакуль вынесем за дужкі.

ПРАВІЛА ДРУГОЕ.

Ешце мяса

Першы савет майстроў выжывання — ешце мяса: вегетарыянства і веганства сёння мала каму па кішэні.

— Калі грошай няма, мяса — самы эканомны прадукт, — кажа Валерый. — Зяленіва цяпер дарагое, а на кілаграме мяса можна пражыць тры-чатыры дні.

Самае бюджэтнае мяса — курынае. Курыцу эксперты раяць купляць цалкам. Кумпячкі, грудкі і ножкі фактычна атрымліваюцца даражэйшымі, да таго ж з цэлай птушкі, падзеленай на кавалачкі самастойна, можна прыгатаваць шмат розных страў.

— Курэй лепш за ўсё купляць у фірменных крамах птушкафабрык. Буйных бройлераў (ад трох кілаграмаў) у крамах адной птушкафабрыкі, напрыклад, я бяру па тры рублі 68 капеек за кілаграм. Куры другой катэгорыі будуць таннейшымі. Іх на ноч ці на суткі кладу ў марынад (воцат, цукар, соль, спецыі) і потым гатую з базавым соусам (курыны булён+мука, пасіраваная цыбуля і морква). Атрымліваецца вельмі смачна, пры тым што страва танная.

ПРАВІЛА ТРЭЦЯЕ.

Успамінайце аб субпрадуктах

Не заўсёды яны ёсць на прылаўках, але ў наяўнасці амаль заўсёды — проста пра іх трэба пытацца. Супавыя наборы (свіныя, ялавічныя, індычныя), а таксама курыныя спінкі, лапкі і шыйкі, свіныя ножкі і іншыя «пячонкі-страўнічкі» — усё гэта часам можна купіць сапраўды за капейкі, а пры правільным гатаванні стравы з іх атрымліваюцца — пальчыкі абліжаш.

— З курыных «спінак» гатуем наварысты булён для першага, а з варанага мяса, калі абабраць яго з костак, здрабніць і абсмажыць з гародніной, будзе гарачае. Або начынка для гуляшоў і запяканак. Яшчэ адзін танны варыянт — мяса свіных галоў. З яго я гатую сальцісоны, зельцы, халоднае.

Рыбу таксама неабходна дадаваць у рацыён — існуе дастаткова танных варыянтаў. Путасу, селядзец, скумбрыя, дробная рачная рыбка ў сезон — усё гэта можна варыць (напрыклад, прыгатаваць юшку), запякаць з соусамі або ў духоўцы. Дарэчы, суп з галоў і «шкілетаў» чырвонай рыбы (такія супавыя наборы прадаюцца ў рыбных аддзелах) многія з задавальненнем варылі і ў часы большага дабрабыту.

ПРАВІЛА ЧАЦВЁРТАЕ.

Рэабілітуйце цукар

Так, цукар вяртаем у рацыён. Нагадаем, гаворка не аб здаровым харчаванні, а пра тое, як скласці сытны рацыён сям'і, калі даходы або пакупніцкая здольнасць рэзка скараціліся. І ў гэтым выпадку цукар — не «белая смерць», а пастаўшчык калорый і станоўчых эмоцый. Лепш за ўсё, калі шукаем якасныя прысмакі за мінімальныя грошы, звярнуць увагу на класіку: усе гэтыя вядомыя з дзяцінства «Му-му» і «Кіс-кіс». Тэхналогіі іх вытворчасці адпрацаваныя многімі дзесяцігоддзямі, а значыць, якасць і смак будуць цалкам прымальныя. Абавязкова ўключаем у рацыён сезонную садавіну. Дарэчы, яе можна купляць эканомна. Напрыклад, вінаград «россыпам» абыдзецца танней, чым у прыгожай гронцы, як і бананы-«адзіночкі», што адарваліся ад «калектыву». Часам такую «некандыцыю» змяшчаюць у крамах асобна, часам пра яе можна спытаць у прадаўца. У любым выпадку падгнілае браць не варта.

ПРАВІЛА ПЯТАЕ.

Купляйце ў запас

Майстар-клас па эканоміі вам можа даць любая бабуля — напрыклад, ваша ўласная. Ці проста прыслухайцеся да размоў бабуль у тралейбусе, які ідзе на рынак: даведаецеся, што пачым і дзе танней. Памятаеце, моладзь пасмейвалася над пенсіянеркамі з торбамі на колцах, якія з раніцы едуць закупляцца? Варта павучыцца эканоміі ў іх. Купляць адзін раз надоўга больш выгадна, чым хадзіць у краму кожны дзень — хоць бы таму, што ўзнікае менш спакус. Да таго ж у вялікіх упакоўках любы прадукт часцей за ўсё абыходзіцца танней. Хоць пералічыць яшчэ раз цану кілаграма ніколі не будзе лішнім — часам крамы, наадварот, імкнуцца выйграць менавіта на буйных упакоўках. Але ў цэлым крупы, бульба-морква-капуста, печыва, чай і г. д. — усё гэта правільней закупляць на працяглы тэрмін. А перад закупкай неабходна мець выразны план, кажа Валерый Еранкевіч, — прыкладнае меню хоць бы на тыдзень, а лепш — на месяц.

Дарэчы, закупляючыся, звяртаем увагу на прадукцыю ўласнай вытворчасці гандлёвых сетак — часам тыя ж прадукты пад брэндам крамы, дзе вы здзяйсняеце пакупкі, аказваюцца на парадак таннейшымі.

— Вырашыўшы эканоміць на ежы, есці трэба ротам, а не вачыма. І купляць толькі тое, што вам патрэбнае, а не тое, што прапануюць, — адзначае Валерый.

Асновай рацыёну могуць стаць крупы — тыя самыя карысныя павольныя вуглеводы, пра якія, дарэчы, кажуць і прыхільнікі здаровага харчавання.

— Я дадаю крупы (манныя, рыс, ячныя) нават у капусту і ў іншыя агароднінныя супы. Першае атрымліваецца больш каларыйным, дае сытасць, і часам пасля сытнага першага другога ўжо не хочацца, — кажа суразмоўнік.

Вядома, успамінаем забыты лозунг «Хлеб — наша багацце»: не каўбаса з хлебам, а хлеб з кавалачкам каўбасы. І ў цэлым не мець у халадзільніку нічога, акрамя бутэлькі соевага соусу, — гэта для лепшых часоў. Цяпер ежа ў доме павінна быць заўсёды, хай нават гэта ўсяго толькі хлеб, крупы, малако, макарона, мука. Дарэчы, гатаваць таксама можна ў запас, калі ёсць час, і адпраўляць на замарозку паўфабрыкаты ўласнай вытворчасці — ад супаў і булёнаў да сырнікаў і катлет.

ПРАВІЛА ШОСТАЕ.

Паклапаціцеся аб прыправах

У Францыі, сусветнай сталіцы гурманаў, ёсць прымаўка: з падліўкай можна з'есці нават падэшву ад абутку. А прыправы робяць лепшай любую страву.

— Калі вы вырашылі харчавацца танна, паклапаціцеся аб спецыях, — раіць Валерый. — Гарчыцу, каляндру, кроп, часнок, цыбулю, сельдэрэй, пятрушку можна вырасціць на падаконніку ў кантэйнерах або на ўласных «сотках». Потым усё гэта сушым або перапіраем з соллю і рыхтуем розныя сумесі прыпраў.

Яшчэ парада — навучыцца гатаваць соусы. Соусы, смажаніну і запраўкі ўласнага гатавання мэтазгодна захоўваць у халадзільніку/маразільніку на запас.

ПРАВІЛА СЁМАЕ.

Вучыцеся смачна гатаваць

Калі вы «на ты» з кулінарыяй, вы заўсёды зможаце сэканоміць на ежы. Гатуйце паштэты і запяканкі, бабкі і калдуны, пячыце бліны і пірагі — гэта смачна, сытна і танна.

— Каб накарміць 50 чалавек, я звычайна выкарыстоўваю 9 кг курыцы. Але калі я гатую паштэт, на тую ж колькасць едакоў хопіць і 5 кг мяса. Прапускаем яго праз мясарубку, дадаём яйка, малако, батон, спецыі, выкладваем на бляху і запякаем пры 180 градусах да апетытнай скарыначкі. Амаль гэтак жа гатуецца і рыбны рулет са свежазамарожанага селядца — я дадаю на кілаграм рыбнага фаршу 300 грам свінога, так рулет атрымліваецца смачнейшы і больш сакавіты. Выдатны варыянт — капусныя запяканкі з фаршам са свініны. Фарш, дарэчы, я рэкамендую гатаваць самастойна: атрымаецца танней, акрамя таго, у недарагі «магазінны» фарш часам ідзе так званы механічны абрэз курыцы.

Бабкі і калдуны — яшчэ адзін спосаб быць сытымі ў рамках вельмі сціплага бюджэту. Тым больш рабіць іх можна, аказваецца, і зусім без мяса.

— У якасці начынкі ў калдуны я часам выкарыстоўваю грэчку. Адварваю яе, смажу з курыным тлушчам (ён прадаецца ў фірменных крамах птушкафабрык і робіць смачнейшай любую страву), дадаю смажаніну з цыбулі і морквы. Людзі пытаюцца: што гэта за начынка такая смачная? А гэта проста грэчка.

Зразумела, гатаваць з дарагіх прадуктаў смачна прасцей і хутчэй, а бюджэтныя стравы «на хуткую руку» прыгатаваць не атрымаецца — прыйдзецца паваждацца, кажа суразмоўнік. Але яно таго вартае. Таму што ежа, вядома, усяго толькі «паліва для арганізма», але зрэдку часаваць сябе неабходна, інакш аднастайнасць смакаў стане яшчэ адным крокам на шляху да дэпрэсіі. Каб гэтага пазбегнуць, эксперыментуйце, праяўляйце кемлівасць, запрашайце сяброў на званыя абеды — падставай, напрыклад, могуць стаць сезонныя стравы. Бо разам заўсёды лягчэй перажыць любыя цяжкасці.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Вікторыя АЛЕШКА:

«Я НЕ СТРАЦІЛА ВЕРЫ...»

«Музыкантам я не стала, бо неяк мая выкладчыца скрыпкі сказала: калі траплю ў аркестр, то буду сядзець у яме. А я разумела, што хачу быць на сцэне ў промнях сафітаў», — згадвае заслужаная артыстка Беларусі Вікторыя Алешка. І сёння, калі яна ўжо адзначае 25-годдзе творчай дзейнасці, задаешся пытаннем: чым вымяраюцца асоба і яе поспех? У выпадку з гэтай артысткай ключавымі паняццямі з'яўляюцца мудрасць і здольнасць пражываць любыя абставіны, арыентуючыся на ўласныя погляды, паважаючы сябе і не зніжаючы планку прафесіяналізму і патрабавальнасці да людзей. Што загартоўвала яе характар, хто даў крылы, каб узляцець і не страціць вышыні, распыталі ў самой спявачкі.

Няма нічога горшага за абыякавасць

— Вікторыя, сёлета Вы адзначаеце 25-годдзе творчай дзейнасці. Што за гэты час на сцэне вы зразумелі пра сябе?

— Ведаеце, я не маю звычкі падводзіць вынікі года, дзесяцігоддзя ці яшчэ нейкага перыяду свайго жыцця. Але з назіранняў за сабой магу сказаць, што ёсць рост у творчым плане. Калі ўзяць нават камплімenты, якія чую ад аўдыторыі і сяброў, то я сёння і 20 гадоў таму — два розныя чалавекі. Не варта забываць і пра адваротны бок нашай прафесіі, дзе за знешняй раскошай, якую бачыць публіка (і ёй здаецца, як жа цудоўна: вось кветкі, авацыі, любоў, прызнанне, грошы), стаіць штодзённая праца над паляпшэннем і пераадоленнем сябе. Я самы звычайны чалавек, які не на аблоках жыве і не кветкамі харчуецца. Не заўсёды хочацца, напрыклад, як сёння, у дождж, уставаць у шэсць гадзін раніцы і збірацца на канцэрты і сустрэчы. Але гэта мая прафесія, якую я сама абрала, таму не скарджуся.

З Васілём РАІНЧЫКАМ.

— Артысту важна быць пазнавальным і не знікаць з поля зроку аўдыторыі, што падштурхоўвае мяняцца вонкава і ў плане музычнага матэрыялу. Вы ў гэтым кантэксце абапіраецеся толькі на ўласную інтуіцыю, або ў тым ліку і на запыты аўдыторыі, тэндэнцыі часу?

— Тут усё працуе ў комплексе, але мне важна разумець, пра што я спяваю. Гэта дапамагае шчыра даносіць матэрыял. Публіка ўсё заўсёды адчувае. Калі песня артысту не блізкая па ўнутраных адчуваннях, то людзі гэта счытваюць, і не варта чакаць, што кампазіцыю прымуць неабыякава. А для артыста няма нічога горшага, чым абыякавасць яго аўдыторыі. Ёсць нават меркаванне, што любая ўвага — гэта добра, але я ўсё ж за тое, каб быць папулярнай за кошт той творчасці, якую нясу са сцэны. Зразумела, артыст не можа ўвесь час быць на вяршыні папулярнасці. Нешта «выстрэльвае», і ты нейкі час знаходзішся на хвалі гэтага поспеху, а потым усё змяняецца зацішшам. У такі час ты не знікаеш, проста працягваеш шукаць новы хіт, які зноў узніме цябе на першыя пазіцыі.

— Скажыце, а калі артыст атрымлівае званні і ўзнагароды, што гэта мяняе ў яго жыцці?

— Такія моманты нясуць за сабой прыцыповыя змены, таму што ты ўжо не маеш права памыляцца. Павінен пастаянна быць на ўзроўні. Гэта толькі маё асабістае меркаванне, але з набыццём ганаровага звання артыст павінен ва ўсім, нават у дробязях, трымаць марку. І для мяне прафесіяналізм самога артыста вызначаецца яшчэ і тым, наколькі зладжана працуе яго каманда. Са мной працуюць гукарэжысёр, адміністратар, стыліст, візажыст, аўтары песень... Я сябе акружыла такімі людзьмі і вельмі люблю ўсіх, хто знаходзіцца побач.

— Вы неаднаразова чулі камплімenты ад знакамітых калег. А да чыёй крытыкі вы здольны прыслухоўвацца?

— Я даражу меркаваннем толькі блізкіх людзей. Калегі наўрад ці могуць сказаць нешта істотнае, бо някай нават спартыўная, але зайздрасць да чужога поспеху існуе. І сапраўды рэдка можна пачуць праўду ў свой бок. Як казала Ала Пугачова, эстрада — гэта клубок змей, што цалуюць адна адну. Таму для мяне самая важная крытыка ад блізкіх, якія шчыра могуць выказаць сваё меркаванне. Сярод такіх людзей была мама. Сёння ў іх ліку і мая блізкая сяброўка Паліна, а таксама мая каманда. І калі нешта раптам ідзе не так, то мне пра гэта адразу скажуць.

Нічога не бывае проста так

— З пастаяннай перыядычнасцю вы радуеце сваю аўдыторыю новымі песнямі і кліпамі. Вясна не стане выключэннем?

— Цяпер мы рыхтуемся да выпуску новай песні, якая, хутчэй за ўсё, будзе называцца «Птушачка». Гэта будзе такая іранічная кампазіцыя ў маім стылі пра ўзаемаадносіны мужчыны і жанчыны. А ў маі адбудзецца вялікі сольны канцэрт, прысвечаны 25-годдзю творчай дзейнасці. Праграму «Дзякую» я прадстаўлю ў знак удзячнасці ўсім людзям, якія ўвесь гэты час мяне падтрымлівалі, дапамагалі і заўсёды былі побач. Асаблівая ўдзячнасць маёй публіцы, без якой не было б артысткі Вікторыі Алешкі.

— Быць артыстам у нашай краіне — гэта поспех?

— Я заспела тыя часы, калі мы ездзілі з гастролямі ў самыя аддаленыя куткі Беларусі, дзе нават гарачай вады не было, як і магчымасці памыць галаву. Таму працаваць даводзілася ў самых розных умовах. За 25 гадоў сцэнічнага жыцця я прайшла калі не праз усё, то праз вельмі многае. Вельмі люблю ездзіць з канцэртамі, бо гэты працэс мае пэўную рамантыку і заўсёды пакідае мора ўражанняў. У нашай краіне ў малых гарадах і вёсках ты адчуваеш цеплыню людзей і душу зямлі беларускай. Памятаю, як у 2017 годзе мы лёталі ва В'етнам на Дні культуры Беларусі, там падчас выканання песень гледачы ўвогуле не праяўляюць эмоцый, а пасля проста ўзрываюцца апладысментамі. І гэта абсалютна ўнікальнае адчуванне... Я проста ўспрымаю сваю прафесію як прызванне ад Бога і радуюся яму.

— Чым сёння для Вас вымяраецца ўзровень камфорту ў жыцці?

— Тут для мяне мае значэнне шэраг аспектаў, але калі прааналізаваць, то адзінае, пра што цяпер задумваюся, — пра будаўніцтва дома. Усё ж хочацца ў плане камфорту і машыну пад дзвярыма паставіць, і выспацца, каб суседзі не перашкаджалі, калі раптам рана ўставаць. Цяпер ужо з такіх пазіцый усё разглядаю, хоць раней была чалавекам каменных джунгляў. Зусім не ўяўляла сябе ў іншым месцы, бо я і родам з Мінска, і ў мяне ніколі не было нават канікулаў у бабулі ў вёсцы. Словам, ніякіх перадумоў, каб палюбіць жыццё там, аднак з узростам зразумела, што гэта таксама складнік камфорту.

— А Вам выпадае адчуваць адзіноту? Як вы спраўляецеся з ёй?

— Калі я была падлеткам, то вельмі марыла пра асабістую прастору. Мы жылі тады ў двухпакаёвай кватэры з мамай і яе бацькамі. Тады я хацела жыць адна, каб ніхто не замінаў. А калі родных не стала, то зразумела, што, як спяваў Ігар Талькоў, «несвоевременность — вечная драма». З узростам адзіноты больш прыгнятае, чым дае адчуванне радасці і камфорту. Таму ў такія моманты выратоўваюць размовы і сустрэчы з сябрамі, а яшчэ ў мяне ёсць кошка Берта, якая ўмее палепшыць мой настрой.

Бліц-апытанне:

1. Якую песню Вы б маглі выбраць саўндтрэкам да свайго жыцця? — Я нарадзілася ў маі, і ўсё ў маім жыцці мяняецца, як майскі вецер. Таму не магу сказаць, што ёсць кампазіцыя, якая вызначала б яго лейтматыў.
2. Назавіце тры галоўныя ўрокі за час Вашай работы ў «Верасах». — Адказнасць. Пунктуальнасць. Прафесіяналізм.
3. Дзеля чаго варта рабаваць каханне і адносіны? — Я свае ніколі не рабавала. Лічу, калі ўсё пайшло не так і атрымаўся раскол, то наўрад ці нешта ўратуе сітуацыю.
4. За рулём аўтамабіля Вы адчуваеце... — Сябе камфортна.
5. Калі Вы гледзіце на зорнае неба, то... — Адчуваю, нібы час і свет спыніліся, а мяне абдымае спакой сусветнага маштабу.

— Пасля таго як не стала мамы, пачалі іначай глядзець на жыццё?

— З маміным сыходам для мяне ўсё змянілася. У нас з ёю была вельмі моцная сувязь, і яна была тым чалавекам, які шчыра мяне любіў і прымаў любой. Цяпер ужо няма сэнсу пасыпаць галаву попелам і казаць пра тое, што, можа, у нейкія моманты я маму не цаніла. На жаль, ва ўсіх тое здараецца. Іншая справа, у жыцці нічога не бывае проста так. Усё адбываецца дзеля чагосьці. Калі сыходзяць блізкія людзі, то мы заўсёды лічым гэта несправядлівасцю. Але я знайшла суцяшэнне ў веры. Малітва супакойвае і дапамагае жыць далей. Гэта адзінае, што працуе, незалежна, верыш ты ці не.

— Ваша вера — гэта з сям'і?

— Не. Мая маці была зусім няверуючай. І ўвогуле да Бога чалавек павінен сам прыйсці. Мяне да яго прывяло жыццё і здарылася гэта яшчэ задоўга да мамінай смерці. Бо, нягледзячы на поспех, запатрабаванасць і вонкавы дабрабыт, я адчувала, нібы ў мяне камень ляжыць на душы. Я не ведала, як ад яго вызваліцца. І ў той момант вырашыла пайсці не да псіхолага, а ў царкву. Сёння я шчаслівая, што ўсё так склалася.

Маю патрэбу, каб мяне паважалі

— Раскажыце, як Вам удалося ў сяброўцы разгледзець роднага для сябе чалавека?

— Калі казаць пра нашу дружбу з Палінай, то гэтае ўсведамленне прыйшло не адразу. Мы знаёмыя ўжо больш за дзесяць гадоў, але не з першай сустрэчы так моцна пасябравалі. Першыя гады чатыры мы проста кантактавалі і адкрывалі для сябе адна адну. А пасля ўжо змаглі пабудаваць нашу дружбу, якую маем цяпер. Сапраўднае сяброўства выпрабоўваецца часам. Наша яго вытрымала.

— А калі гаварыць пра каханне, то што тут дапамагае не страціць веру пасля няўдалага вопыту?

— Усе людзі розныя. Я, дзякаваць богу, не страціла веру ў каханне. Ужо шмат гадоў прайшло з таго моманту, як мы разышліся з мужам, і сёння мы нават сябруем. Таму тут вельмі ўсё індывідуальна. І з розных прычын людзі разыходзяцца. Бывае, што сям'я разбураецца, калі муж і жонка ўжо амаль дваццаць гадоў у шлюбе, і гэта больш страшна, чым разысціся пасля года сумеснага жыцця. Напрыклад, для мяне некалі развод успрымаўся як трагедыя, але напарадзе было цэлае жыццё. А калі, лічы, пражылі яго вялікую частку разам, а потым з'яўляецца жаданне нешта памяняць, то там без псіхолага ўжо і не абыдзешся. Таму я не бяруся тут нешта раіць.

— Вы раслі без бацькі. Калі пачалі задавацца пытаннямі адносна яго і ці адчувалі татаву адсутнасць па жыцці?

— Я не ведаю ні бацьку, ні яго сям'ю. Адсутнасць яго я адчувала толькі ў падлеткавым узросце. Таму што ў гэты перыяд у цябе ўсе пачуцці аголеныя. Ты бачыш іншыя сем'і, дзе тата ёсць, і ён заўсёды падтрымае і абароніць, і, вядома, пачынаеш параўноўваць. А мама заўсёды была вельмі катэгарычнай, калі я пачынала задаваць пытанні. У 14 гадоў я зрабіла спробу пазнаёміцца з ім, але яна аказалася няўдалай. І больш ужо не цікавілася. Калі ж у 16 гадоў трапіла да Васіля Пятровіча Раінчыка, і з часам жыццё пачало складвацца зусім па-іншаму, то нават радавалася, што не з'явіцца няпрошаныя родзічы. Мы ж з імі проста чужыя людзі.

— Вы ўвогуле здольныя даць другі шанц людзям, калі яны здрадзілі ці памыліліся?

— Ведаеце, ёсць выслоўе, што няма веры таму, хто аднойчы здрадзіў. І я ў сваім жыцці такія рэчы з першага разу засвойваю. Калі чалавек здраджвае, то няхай Бог яму даруе, але я ўжо не буду падтрымліваць зносіны. А ў выпадку нейкіх рэчаў, накшталт непунктуальнасці (я гэтага ў рабоце вельмі не люблю), то я не заўсёды катэгарычная. Магу пагаварыць і даць магчымасць выправіцца. Увогуле заўсёды трэба індывідуальна разглядаць сітуацыю.

— Хто дазваляе Вам адчуваць сябе слабай?

— Мая сяброўка Паліна. Яна малодшая за мяне на восем гадоў, але мяне лічыць сваёй малодшай сястрой. Паліна заўсёды паводзіць сябе як разважлівы чалавек, а я побач з ёй нібы дзіця. І я вельмі чакаю, што аднойчы змагу так сябе адчуваць і побач з каханым мужчынам.

З сяброўкай Палінай.

— Цяпер толькі лянівы не гаворыць пра любоў да сябе. У чым для Вас яна праяўляецца?

— Не скажу, быццам не люблю сябе, бо іначай не пайшла б у артысткі. А выяўляецца мая любоў да сябе ў тым, што я маю патрэбу, каб мяне паважалі. Колькі сябе памятаю, усё стараюся рабіць для гэтага. Я гадамі напрацоўваю сабе рэпутацыю паважанага чалавека, і, лічу, раблю тое паспяхова.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва артысткі.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-4487 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – мастерские) общей площадью 1273,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4.

Имеется обременение со стороны 3-х лиц в виде аренды капитального строения, инв. № 400/С-4487, сроком по 31.12.2022 г.
Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000001002123, площадью 0,5583 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений автодрома для обучения вождению), находящемся по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4.
Начальная цена продажи лота – 1 015 090 руб. (один миллион пятнадцать тысяч девяносто рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 101 509 руб. (сто одна тысяча пятьсот девять рублей)

Условия проведения аукциона:
- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя;
- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты – по договоренности сторон

Продавец – Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28, тел. 8-0152-72-30-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 15 апреля 2022 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 15.04.2022 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 13 апреля 2022 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества УГП «Трест «Гродногорстрой» (УНП 500110650), объявляет о проведении **29.03.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/03/spisok-imushhestva-grodnogorstroj.pdf

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 (29) 866-10-00, Наталья Николаевна

Продавец: УГП «Трест «Гродногорстрой».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **28.03.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **15.03.22** по 17.00 **28.03.22** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 120,00 бел. руб.; расходы на организацию и проведение аукциона – 584,10 бел. руб.; аукционный сбор: 2 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пятнадцати рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения электронных торгов, если иное не установлено собранием (комитетом) кредиторов.

Информация о проведении повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже недвижимого имущества государственной формы собственности

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-187520 площадью 825,3 кв. м, расположено по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Зеньковой, 1Ш-3, наименование – подвал, назначение – помещение неустановленного назначения. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000851 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Зеньковой, 1, площадью 0,2750 га, целевое назначение – для обслуживания здания корпуса № 2 (право долевой аренды – доля в праве ОАО «ВИСТАН» 1295/10000).

Нач. цена: 60 567,95 бел. руб. без НДС.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 29.03.2022 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга».

Извещение о проведении повторного открытого аукциона опубликовано 12.03.2022 на сайтах Государственного комитета по имуществу http://www.gki.gov.by/, https://au.nca.by/ (№ 8947), на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.cpo.by**
Продавец	**ОАО «Управление СтройМеханизации», 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 23, пом. 23**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона:
НЕЗАВЕРШЕННОЕ ЗАКОНСЕРВИРОВАННОЕ КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ
(здание неустановленного назначения),
инв. № **714/U-33729**, общ. пл. **1 150,2 кв. м**, готовность **57 %,** 2-этажное здание с подвалом и мансардой.
Адрес: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Вязьевский с/с, 20, вблизи д. Смык.
Земельный участок оздоровительного назначения, общ. пл. **1,0000 га,** предоставлен на праве постоянного пользования, находится в живописном месте в лесу на берегу озера.
Начальная цена: **573 600,00 бел. руб.** (с НДС 20 %).
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах: электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1,5 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания торгов:
15.04.2022 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **13.04.2022** до 17.00

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by.**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: Ford Transit (легковой (вагон)), 2009 г. в., пробег 234 762 км, гос. № 1157 ЕС-4, цвет – темно-синий, разрешенная максимальная масса – 3000 кг.

Начальная цена продажи лота – 19 000 руб. (девятнадцать тысяч рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1900 руб. (тысяча девятьсот рублей)

Продавец – Дочернее унитарное предприятие «Проектный институт Гродногипрозем» республиканского унитарного предприятия «Проектный институт Белгипрозем»

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона: возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказанию услуг по независимой оценке транспортного средства в размере 181,50 руб.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.
Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – P/c BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 28 марта 2022 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.10.2021 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 24 марта 2022 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет повторного электронного аукциона

Лот № 1
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, ул. Слуцкое шоссе, 26

Здание магазина (общ. пл. 268,9 кв. м, инв. № 600/С-171336, составные части: пристройка, сарай-пристройка, сарай).
Сведения о земельном участке: пл. **0,1222** га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 25.01.2120) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав: природная территория, подлежащая спец. охране (в зоне санит. охраны источников питьевого водоснабжения централиз. систем питьев. водоснабжения (3-й пояс-262, 267-268)

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 469 862,64 бел. руб.
(снижена на 35 %)

Лот № 2
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, аг. Озерцо, ул. Центральная

Магазин № 1 (общ. пл. 127,2 кв. м, инв. № 600/С-132938, составные части: пристройка, склад, уборная).
Сведения о земельном участке: пл. **0,0885** га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 04.04.20141) для обслуживания здания магазина № 1

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 180 872,46 бел. руб.
(снижена на 60 %)

Лот № 3
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Калинина, д. 36

Столовая (общ. пл. 282,8 кв. м, инв. № 600/С-117001, составные части: три пристройки).
Сведения о земельном участке: пл. **0,0659** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 192 060,00 бел. руб.
(снижена на 60 %)

Лот № 4
Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница

Здание торгового центра (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 3109,6 кв. м, инвентарный номер 600/С-100734, составные части и принадлежности: подвал, площадка).
Сведения о земельном участке: общей площадью 0,5973 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли.
Обременение: площади здания частично сданы в аренду. Договоры аренды № 24/21 от 31.03.2021 с ОАО «Белагропромбанк», № 22/21 от 31.03.2021 с РУП «Белпочта» без возможности досрочного расторжения до 31.10.2026»

Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 2 990 000,00 бел. руб.
(снижена на 13 %)

Лот № 5
Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, 34А-2

Кафе «Хельсинки» (помещение общественного питания, общ. пл. 768,1 кв. м, инв. № 602/D-35365)

Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 709 560,32 бел. руб.
(снижена на 10 %)

Лот № 6
Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодёжная, 12

Административное здание (общ. пл. 1079,3 кв. м, инв. № 630/С-54835).
Сведения о земельном участке: **пл. 0,1244 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания администрат. здания

Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 771 120,00 бел. руб.
(снижена на 30 %)

Лот № 7
Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, д. Мижречье, ул. Центральная, д. 2А

Магазин (здание специализированное розничной торговли, общ. пл. 39,7 кв. м, инв. № 602/С-45187, составные части и принадлежности: сарай-пристройка).
Сведения о земельном участке: **пл. 0,0179 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона р. Свислочь

Начальная цена лота № 7 с НДС 20 % – 3 297,49 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лотам №№ 1–3, 5–7 – 4 %, по лоту № 4 – 1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.02.2022

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов в 14.00 29.03.2022. Окончание торгов в 15.00 29.03.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.03.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

СКАЖОНАЕ АСВЯТЛЕННЕ АСОБНЫХ З'ЯЎ:

Савелічаў, Скобелеў і іншыя ахвяры

Ад пісьменнікаў заўсёды чакаюць праўдзівага адлюстравання жыцця. І калі такіх твораў не хапае, калі яны зусім не з'яўляюцца, калі пісьменнік далёкі ад рэчаіснасці, тады аўтарытэт мастацкага слова прыніжаецца. А літаратура як частка агульнай мастацкай культуры мізарнее, адыходзіць на задні план зацікаўленняў грамадства. Таму зразумелымі становяцца памкненні пісьменнікаў выйсці за «межы дазволенага», сказаць тую праўду, якую ад іх чакаюць не на старонках штодзённай грамадска-палітычнай газеты, а ў рамане ці аповесці, якія чытач адкрывае сам-насам.

А часопісы як частка агульнадзяржаўнага механізму палітычнага выхавання грамадства далёка не заўсёды гатовы надрукаваць усё тое, што выпакутаваў, тое, што перажываў за пісьмовым сталом літаратар. Хоць і ў часопісах, выдавецтвах працуюць таксама пісьменнікі, яны таксама бачаць сапраўднае жыццё і па логіцы павінны змагацца за адлюстраванне праўды... Ці заўсёды гэта ўдавалася, ці хапала смеласці пайсці следам за смелым мастацкім выкладаннем рэчаіснасці?..

Як фрагмент ранейшага літаратурнага і выдавецкага жыцця — выкладзенае ў адным з цікавых дакументаў, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Размова — пра даведку, якая была пададзена сакратару ЦК Кампартыі Беларусі таварышу Пілатовічу Станіславу Антонавічу 26 жніўня 1970 года. Пададзена начальнікам Галоўнага ўпраўлення па ахове дзяржаўных тайн у друку пры Савеце Міністраў БССР А. Маркевічам. Назва абагульненай даведкі для тых, хто памятае савецкія часіны, нават і не 1930—1940-я гг., а болей блізкія — напрыклад, 1960—1970-я гг., гучыць пагрозліва: «Пра ідэйна-палітычны ўзровень некаторых твораў друку, прадстаўляемых на кантроль рэдакцыямі часопісаў «Неман» (тады, у 1970-м, — яшчэ не «Нёман». — А. К., В. С.), «Полымя», «Маладосць».

Чытаем на пачатку даведкі: «Галоўнае ўпраўленне па ахове дзяржаўных тайн пры Савеце Міністраў БССР у кожным асобным выпадку інфармавала аддзел прапаганды і агітацыі ці аддзел культуры ЦК КП Беларусі пра ідэйна-палітычныя недахопы асобных твораў друку, падрыхтаваных для апублікавання рэдакцыямі нашых літаратурна-мастацкіх часопісаў...»

Размова ў даведцы — пра публікацыі 1967—1970 гг. Хто ж тады такія смелыя кіравалі рэдакцыямі «тоўстых» часопісаў Беларусі, што адважна супраціўляліся патрабаванням такой суровай арганізацыі, якая стаяла на варце тайн, а на самай справе пільна вартавала, адсочвала спробы парушыць ідэйна-палітычныя, ідэалагічныя бастыёны савецкай улады? У «Полымі» з 1967 да 1972 года галоўрэд — празаік, дзіцячы пісьменнік Павел Кавалёў. У «Немане» з 1966 да 1977 года галоўным рэдактарам працаваў вядомы драматург, аўтарытэтны і ў творчым асяроддзі, і сярод партыйнага начальства Андрэй Макаёнак. Яго п'есы ішлі ў многіх і многіх тэатрах Савецкага Саюза. «Маладосць» у 1966—1972 гг. рэдагаваў празаік Алесь Асіпенка. Што ж прымусіла начальніка Галоўнага «цэнзарскага» ўпраўлення А. Маркевіча, нягледзячы на адладжаны механізм стасункаў з адзделамі ЦК, пісаць аднаму з сакратароў рэспубліканскай партыйнай арганізацыі?.. Праўда, дакладная, адрасаваная С. Пілатовічу, трапіла на разгляд другому сакратару — Фёдару Анісімавічу Сурганаву. Вось яго рэзалюцыя, якую высокі партыйны чыноўнік наклаў 26 жніўня: «...Трэба рашучым чынам звярнуць увагу рэдакцыйных калегій часопісаў «Неман», «Полымя», «Маладосць» на неабходнасць строга і няўхільна выконваць патрабаванні, выкладзеныя ў вядомай пастанове ЦК КПБ па гэтым пытанні...»

Даведка патлумачвае, якое рашэнне ЦК маецца на ўвазе: «Праналізаваўшы заўвагі, зробленыя за апошнія тры гады, лічым неабходным давесці пра іх у абагульненай даведцы з улікам патрабаванняў пастановы ЦК КП Беларусі «Аб павышэнні адказнасці кіраўнікоў органаў друку, радыё, тэлебачання, кінематографа, устаноў культуры і мастацтва за ідэйна-палітычны ўзровень друкуемых матэрыялаў і рэпертуару». І далей: «Аналіз заўваг, зробленых Галоўным упраўленнем па ўзгадненні з адпаведнымі аддзеламі ЦК КП Беларусі, паказвае, што рэдакцыі літаратурна-мастацкіх часопісаў «Неман», «Полымя», «Маладосць» не заўсёды праяўляюць неабходную патрабавальнасць да ідэйна-палітычнага зместу твораў, якія мяркуюцца да друку. У выніку асобныя аповесці, апавяданні, артыкулы ці нарысы затрымліваліся і вярталіся рэдакцыям на дапрацоўку і выпраўленні, а некаторыя — зусім здымаліся».

Якія ж заўвагі падаліся пільнаму кантрольнаму воку найболей важкімі і прынцыповымі?.. «...1. скажонае асвятленне асобных з'яў савецкай рэчаіснасці; 2. скажэнне праўды пра партызанскую барацьбу на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і прыніжэнне герояў гэтай барацьбы; 3. прадузятае, аднабаковае асвятленне асобных з'яў у жыцці калгаснай вёскі».

І вось прыклады такога «скажэння»... «У №№ 9, 10 часопіса «Неман» за 1969 плануваўся да публікацыі раман Э. Скобелева «Крокі за тваёй сцяной» («Шаги за твоей стеной»). Пасля прачытання папярэднім кантролем раман па ўзгадненні з аддзелам прапаганды і агітацыі ЦК КПБ быў вернуты рэдакцыі на перапрацоўку...» Размова — пра твор маладога, але ўжо пры пасадзе празаіка Эдуарда Скобелева, які быў на службе ў ЦК КПБ. Прызнацца, цяпер, азіраючыся на шматтом'е напісанага Эдуардам Мартынавічам Скобелевым (1935—2017), літаратарам у сваіх творах няроўным, часам надзвычай прамалінейна-грубаватым, і не паверыш, што да першага яго рамана былі такія заўвагі... Цэнзуру непакоіла, што «Сама ідэя рамана — савецкія людзі як быццам адгароджаны адзін ад другога нейкай непраглядной сцяной, абыякавыя адзін да аднаго, жывуць у залежнасці ад выпадковых абставін, не маючы агульных мэт — з'яўляецца памылковай». «Як блізкія ў прасторы і як далёкія душэўна людзі, — разважаў герой рамана, камуніст Сяргей Козараў. — Вось жа кожны ад нечага пакутуе, у кожнага ці многіх нешта баліць і ніхто нічога не ведае. І ніхто не працягне рукі. Кожны шукае паратунак толькі для сябе, і таму ніхто не знаходзіць яго». І далей: «Раман быў населены вобразамі нейкіх ненармальных, душэўна хворых людзей, з'яўленне якіх у жыцці тлумачыцца абыякавасцю, раўнадушшам навакольнага асяроддзя».

З акцэнтам на ценявыя бакі ў рамане былі пададзены і вобразы камуністаў.

Толькі пасля карэннай перапрацоўкі з улікам выказаных заўваг раман быў надрукаваны ў 11, 12 нумарах часопіса «Неман».

Праз лічаныя месяцы раман Э. Скобелева пабачыў свет асобнай кнігай. У 1970 годзе аўтара прынялі ў Саюз пісьменнікаў. Надалей пісьменнік звярнуўся да гістарычнай прозы, да дзіцячай літаратуры. Аповесць Эдуарда Скобелева «Прыгоды Гарбузіка і Бябешкі» набыла неверагодную папулярнасць. У 1998 годзе Э. Скобелеў за кнігі «Новыя неверагодныя прыгоды Арбузіка і Бябешкі» і «Дзіўныя прыгоды пана Дылі і яго сяброў Чосева і Ганзасека» стане лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Гісторыя з цэнзарскім замахам на адзін з першых твораў Эдуарда Мартынавіча стала ў некаторай ступені ўрокам для пісьменніка і яго творчую ініцыятыву не спыніла. Праз многія гады Скобелеў скажа, у нечым падсумоўваючы зробленае ім у літаратуры: «Калі б я быў выдадзены поўнасцю, гэта была б цэлая бібліятэка з сотні паўнавартасных тамоў. Але я выдадзены толькі на трэць, прытым шэраг кніг выдадзены за мой кошт. Што гэта такое ў фінансавых адносінах, вам можа сказаць кожны, каго так і не падпусцілі да вялікай літаратуры.

Далей разглядаецца проза Аркадзя Савелічава (1933—2008). З даведкі, адрасаванай у ЦК КПБ: «Скажэнне маральнага аблічча савецкага маладога чалавека ўтрымлівалася і ў апавяданнях на маральную тэму А. Савелічава «Ідуць цягнікі» (ці «Шчаслівы») і «Трататушкі», прызначаныя да публікацыі ў № 9 за 1968 год і ў № 11 за 1969 год часопіса «Неман».

Галоўны герой апавядання «Ідуць цягнікі» — чалавек з засмучанай псіхікай. І натуральна, што ён не можа рэальна ўспрымаць навакольную рэчаіснасць. Ён хворы. Па сцвярджэнні ж аўтара атрымліваецца, што толькі чалавек, які адхілены ад бягучых абставін, з хворым уяўленнем, па-сапраўднаму шчаслівы. Усе ж астатнія персанажы апавядання — людзі і фізічна, і разумова нармальныя, але яны, па пераканані аўтара, беспрынцыпныя, маральна распушчаныя і разбэшчаныя.

Апавяданне «Трататушкі» — пра камсамольскую будоўлю. У ім і гераіня апавядання, і кіраўніцтва, і перадавікі будоўлі паказаны, як маральна паўшыя людзі. Нічога светлага, вакол пошласць, бруд, п'янства, разбэшчанасць. Брыгада выведзена як калектыў, які аб'яднаны толькі «бутэлькай». Кіраўнік будоўлі чалавек стомлены ад усяго і заклапочаны толькі тым, каб сысці адсюль хутчэй. І ўвогуле праца нікому не прыносіць радасці.

Пасля заўвар абодва апавяданні рэдакцыяй былі знятыя з падрыхтаваных да друку нумароў».

А можа быць, малады празаік хацеў заглыбіцца ў сваіх герояў?.. Пісала ж у пачатку 1960-х гг. прыкметны і цікавы літаратурны крытык Юлія Канэ пра сучасную беларускую прозу: «Адна з жыццёва надзённых праблем нашай літаратуры — неабходнасць паглыблення яе псіхалагізму. Псіхалагізм — не толькі адзін з найважнейшых сродкаў стварэння праўдзівых чалавечых характараў. Герой нашай літаратуры — радавы чалавек, чалавек з масы. Пранікненне ў яго псіхіку, у «таямнічую лабараторыю чалавечага сэрца» (Бялінскі) дае глыбокую карціну духоўнага жыцця грамадства, паказвае ступень яго набліжэння да ідэалу...» Аркадзю Савелічаву, атрымліваецца, не далі магчымасці «паглыбіцца...»

І гэта, з пункту гледжання «цэнзуры», не ўсе пралікі часопіса, аўтарытэт якога ў другой палове 1970-х гг. прыўзняла і публікацыя рамана Габрыеля Гарсія Маркеса «Восень патрыярха» ў перакладзе на рускую мову В. Тараса і К. Шэрмана. Настолькі, што тыраж Немана» пераўзыйшоў 100 тысяч экзэмпляраў. «...Зняла рэдакцыя заверстаны ў другі нумар часопіса «Неман» за 1969 год нарыс А. Шумава «Ветэраны». На наш погляд, у ім утрымлівалася няправільная трактоўка сутнасці мерапрыемстваў партыі і ўрада, накіраваных на паляпшэнне быту інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. З аўтарскіх разваг, разваг герояў нарыса выходзіла, што савецкі ўрад толькі на словах праяўляе клопат пра інвалідаў Айчыннай вайны, а аб пераўтварэнні ў жыццё прынятых законаў і пастаноў не думае. Таму гэтыя законы на месцах не выконваюцца. Мясцовыя ж органы савецкай улады ўсяляк імкнуцца ўшчаміць правы інвалідаў, а часам проста здзекуюцца з іх.

Такія вось пралікі ў мастацкай прозе, якая рыхтавалася да друку ў «Немане» — «Нёмане», знайшлі пільныя кантралёры дзяржаўных тайн...

Мікола БЕРЛЕЖ,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.

Агляд часопіса: лютаўская «Маладосць»

ЖАДАННІ І ЗДЗЯЙСНЕННІ

Убачыў свет лютаўскі нумар часопіса «Маладосць». Тыражы літаратурна-мастацкіх выданняў сёння не дужа вялікія. І ў рознічным гандлі не так проста знайсці іх, таму «Звязда» імкнецца падрабязна знаёміць чытачоў са зместам аўтарытэтных літвыданняў. А прачытаць, між іншым, на іх старонках заўсёды можна шмат цікавага.



У лютаўскім нумары «Маладосці» прозу і паэзію прадстаўляюць Юлія Макарэвіч (друкуецца яе апавяданне «Запаветнае жаданне»), Марына Варабей (змешчана яе вершаваная падборка «Дыхаем пра адно і тое»), Ліндо Рандзір (знаёмцеся з яго апавяданнем «Дзяўчына Міра»), Ірына Чачотка (паэтка сярод іншых твораў знаёміць з вершам «Каліна зімы», які адрасуе «Памяці Я. Янішчыц), Яна Нікіфарава (паэтэса, аўтар двух зборнікаў, у «Маладосці» выступае з двума кароткімі апавяданнямі), Яна Цэгла (адрасуе чытачу падборку казак), Андрэй Кімбар (не абміне яго вершаванную падборку «Золку чароўныя сполахі»). Выступаюць у нумары і пісьменнікі старэйшага пакалення: Навум Гальпяровіч з маленькай аповесцю «Горад», Хведар Гурыновіч з падборкай вершаў «Полымя, вада, жанчына», Уладзімір Мазго з цыклам лірычных мініяцюр «Зніклі вечнасці».

Уражальнай падаецца публікацыя ў раздзеле «Пераклады» — «Маладосць» друкуе пераклады апавяданняў Джэймса Джойса «Эвелін», «Маці», «Трагічны выпадак». Над пераўвасабленнем твораў вялікага ірландскага пісьменніка рупіліся студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Андрэй Палуян, Марына Макарыч, Кацярына Гулецкая.

Дасведчаны архівіст і літаратуразнавец Віктар Жыбуль падрыхтаваў для «Маладосці» дзённікавыя запісы Алеся Наўроцкага, аб'яднаныя адной назвай — «Споведзь». З прадмоўкі да публікацыі: «...«Споведзь» — гэта, можна сказаць, спалучэнне дзённікавага, мемуарнага і белетрыстычнага жанраў, а месцамі і журналісцкага рэпартажу: пісьменнік не без іроніі занатоўваў пачутае на канферэнцыях медработнікаў і сесіях сельсавета. Яшчэ адна частка, пад назвай «Запісная кніжка (Калі я працаваў санфельчарам)», увабрала ў сябе пачутыя дыялогі, жарты, прыказкі, прымаўкі і асобныя словы». Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага выступае з артыкулам Юлія Кавалёва. Знойдзеце ў лютаўскай «Маладосці» і інтэрв'ю публіцыста Зіновія Прыгодзіча з Уладзімірам Слабодчыкавым «Скульптура — мастацтва без слоў». Наконт пытання, ці не ўстарэў жанр рамана, разважаюць Алег Ждан, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Генадзь Аўласенка.

Паверце, у лютаўскай «Маладосці» ёсць што пачытаць. Не пашкадуеце, адкрыўшы гэты нумар часопіса.

Мікола БЕРЛЕЖ.

У МІНСКУ ПРОЙДЗЕ З'ЕЗД САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Грамадскае аб'яднанне пісьменнікаў краіны, якое сёння ўзначальвае вядомы празаік, грамадскі дзеяч Мікалай Чаргінец, — адна з найбольш прадстаўнічых творчых арганізацый Беларусі. У склад яе ўваходзяць сотні празаікаў, паэтаў, публіцыстаў, літаратурных крытыкаў з розных рэгіёнаў Беларусі.

22 сакавіка 2022 года дэлегаты ад сямі рэгіянальных аддзяленняў творчай арганізацыі і — з Мінска, Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай абласцей — збяруцца на XXV з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі. Справаздачу за апошнюю пяцігодзіч літаратары будуць трымаць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Удзел у з'ездзе возьмуць каля 200 літаратараў, а таксама некалькі дзясяткаў гасцей — кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Сяргей ШЫЧКО.

ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ПАМЯЦЬ

Як зберагчы і зрабіць даступнай гістарычную спадчыну?

Захоўваць гістарычную памяць у кніжных крыніцах, рабіць яе даступнай і папулярнай ва ўсім свеце — так вызначаюць адну з важных задач у рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на сучасным этапе. А ўстанова сёлета святкуе 100-годдзе з моманту свайго ўзнікнення. З нагоды прыгожай даты і ў рамках Года гістарычнай памяці рэалізоўваецца і ёсць у планах шмат праектаў. Пра гэта і распавялі нядаўна падчас сустрэчы з журналістамі прадстаўнікі бібліятэкі, выдавецтва «Беларусь» і Нацыянальнага архіва Беларусі.

Для Нацыянальнай бібліятэкі ініцыятыва абвяшчэння 2022-га Годам гістарычнай памяці — гэта сапраўдны падарунак, лічаць яе супрацоўнікі. Бо гэта тое, чым яны займаюцца штодня на працягу ўсіх ста гадоў існавання бібліятэкі. Гэта ўстанова, якая арыентуецца найперш на гісторыю, культуру свайго народа. І зберажэнне нацыянальнай дакументальнай спадчыны — яе першы абавязак. Вельмі важнае дасягненне — напярэдадні юбілею ў бібліятэцы перасягнуты 10-мільённы аб'ём дакументаў уласных калекцый.

Сапраўды, у фондах установы можна знайсці самыя розныя крыніцы інфармацыі. Старажытныя рукапісы, летапісы, царкоўныя кнігі... Дарэчы, ужо цяпер больш як тры чвэрці наведвальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі — гэта тыя, хто прыходзіць праз вэб-партал, які сёння становіцца галоўнай крыніцай інфармацыі пра Беларусь. Праз інтэрнэт-партал НББ можна атрымаць доступ да мільёнаў вывераных і аўтарытэтных навуковых крыніц пра нашу краіну. Ва ўстанове заўсёды адкрытыя да супрацоўніцтва. Так, летась ўбачыў свет альбом, прысвечаны Напалеону Ордзе і выявам беларускіх гарадоў, мястэчак, замкаў, палацаў XIX ст., зробленым гэтым мастаком, а сёлета выйшла кніга, дзе прадстаўлена гісторыя беларускага буквара.

Вядзецца работа і ў рэчышчы таго, каб аднаўляць і вяртаць тую дакументальную спадчыну, што была страчана ў няпростыя перыяды гісторыі. Напрыклад, перад Вялікай Айчыннай вайной у фондах бібліятэкі налічвалася каля двух мільёнаў дакументаў. А пасля яе завяршэння іх колькасць стала складаць каля 320 тысяч. Прыблізна 16 % фонду перажыло вайну. А ўсё астатняе было альбо знішчана, альбо вывезена за межы Беларусі акупантамі. І дагэтуль, на вялікі жаль, пакуль не ўсё здолелі аднавіць і вярнуць. І гэта таксама важная задача для далейшай работы.

Вольга ВАНІНА, намеснік дырэктара выдавецтва «Беларусь», распавяла пра работу, якую іх структура робіць для таго, каб папулярызаваць і выдаваць кнігі, што дазволяць кожнаму больш даведацца пра гісторыю нашай краіны і яе герояў.

— Для нас таксама тэма гістарычнай спадчыны з'яўляецца пастаяннай. У нас ёсць шмат серый, прысвечаных гісторыі, і яны адрасаваныя чытачам розных узростаў. Так, мы працягнем выпуск выданняў з серыі «Беларусь памятае: у імя жыцця і міру», «Беларусь. Трагедыі і праўда памяці» — гэта кнігі пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і пра ахвяры, масавыя ў той час. На чарзе ў нас выпускі, прысвечаныя Віцебскай, Магілёўскай абласцям, Мінскаму гета і Брэсту. Серыя будзе мець яшчэ шмат кніг. Бо такія старонкі гісторыі трэба для сябе адкрываць, і іх нельга забываць. Для юных чытачоў выходзіць серыя «Гісторыя для школьнікаў». Кнігі ў ёй напісаны простай і даступнай мовай, і кожная з іх прысвечана пэўнай падзеі беларускай гісторыі пачынаючы ад старажытнасці. Сёлета плануем выпускаць кнігу сумесна з Інстытутам гісторыі і Нацыянальным архівам, прысвечаную дэпутатам Вярхоўнага Савета першага склікання БССР. Акрамя таго, у нас выходзяць кнігі пра культуру Беларусі. Цяпер у рабоце — выданні пра вадзяныя млыны, пра бортніцтва, пра народны каляндар беларусаў.

Што датычыцца Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, то і гэтай установай вядзецца актыўная дзейнасць па папулярызацыі і падрыхтоўцы новых выданняў, што захоўваюць праўду і сведчаць дакументальна пра падзеі нашай гісторыі. Як адзначыў **Святаслаў КУЛІНОК, загадчык аддзела публікацый Нацыянальнага архіва,** яны таксама робяць пэўныя крокі для ўвядзення ў навуковы абарот дакументаў:

— Гістарычная спадчына — гэта дакументальная памяць, што захоўваецца ў архівах. І Нацыянальны архіў — найбуйнейшы захавальнік дакументаў па навейшай гісторыі Беларусі. Для любога архіва, як і для бібліятэкі, адна з найважнейшых задач — гэта захаванне дакументаў. Аднак мы не можам заставацца ў баку і перакананыя, што архівы павінны таксама займацца і папулярызацыяй, і ўвядзеннем у навуковы абарот дакументаў, — кажа Святаслаў Кулінок. — Толькі за апошнія пяць гадоў, з 2017 да 2021 года, архівам выдадзена 19 папяровых зборнікаў дакументаў, тры электронныя мультымедыйныя зборнікі, адно даведачнае выданне, два буклеты. Для няпрофільнай установы гэта нядрэнны вынік. Апошнім часам мы працуем над вельмі важным для нашай краіны праектам — шасцітомнай серыяй «Без тэрміну даўнасці», дзе адлюстроўваюцца злачынствы нацыстаў і іх памагатых на нашых тэрыторыях супраць мірнага насельніцтва. Ужо ўбачылі свет чатыры кнігі, і сёлета мы плануем завяршыць гэтую серыю. Увогуле мы імкнёмся максімальна разнастаіць нашу публікацыйную работу. Нядаўна актывізавалася работа па падрыхтоўцы манаграфічных даследаванняў. І 2022 год для нас таксама вельмі важны. Напрыклад, плануем прадставіць выданне, прысвечанае творчасці партызанаў, дзе апублікуем шматлікія малюнкі, партрэты, звязаныя з баявой і дыверсійнай дзейнасцю, таксама ў ім знойдуць адлюстраванне партызанскія сатыра і гумар. Хочацца таксама анансаваць нашы сумесныя з НББ мультымедыйныя праекты. Так, ідзе работа над серыямі «Перасяленцы з БССР» і «НЭП у БССР».

Алена ДРАПКО.

Няскончаныя кнігі

ЗНОЙДЗЕНЫ АРКУШЫ СА СТАРАЖЫТНАЙ ДРУКАРНІ

У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь адкрылася незвычайная выстаўка. На ёй паказаны папяровыя скарбы, якія зусім нядаўна ўдалося адшукаць у старажытным гродзенскім храме, што размяшчаецца ў самым цэнтры горада.

Некалі тут быў цэлы комплекс брыгіцкага манастыра, які складаўся з шэрагу пабудоў. На сёння гэта адзіны храм, звязаны з ордэнам брыгітак, які захаваўся. Пры гэтым у ім ацалеў архіў старажытнай друкарні — неразрэзаныя і не падзеленыя на брашуры аркушы XVII—XVIII стагоддзяў. На кожным з іх размяшчаецца па восем старонак тэксту. Старадаўнія лісты дайшлі да нашага часу ў выдатным стане — хоць бяры і працягвай справу, чамусьці не скончаную пераплётчыкамі чатыры сотні гадоў таму. Такія аркушы павінны былі складацца

ў асобныя сшыткі, перашывацца разам, абразацца і пераплятацца ў форму кнігі-кодэкса. Дарэчы, у сусветнай практыцы ўжо трапляліся такія знаходкі, і з друкарскіх лістоў выдатна складаліся брашуры. Што цікава, захавалася багата аднолькавых аркушаў — гэта сведчанне таго, што захавалася частка, калі не цэлы тыраж, дзвюх кніг — «Статута ордэна брыгітак» 1673 года і «Брэвіярыум» 1748 года.

Старажытныя дакументы былі адшуканыя ў Гродне айцом Антоніем Грэмзам і перададзены Нацыянальнай бібліятэцы.

Падобная знаходка ў Беларусі дае надзею, што яшчэ могуць

паўстаць і іншыя рарытэты, пакінутыя нам мінулым.

Выстаўка «Кніжныя скарбы з манастырскага куфра», на якой прадстаўлена знаходка, дае ўяўленне пра тое, як друкаваліся кнігі ў мінулыя стагоддзі, дапамагае асэнсаваць і візуальна ўявіць старажытную тэхналогію, па якой яны збіраліся і перапляталіся.

Калекцыянер, букініст Алег Судлянкоў падчас адкрыцця выстаўкі звярнуў увагу, што такія манастырскія скарбы паказваюць: за трыста гадоў змянілася толькі тэхніка, а самі тэхналогіі (шматстаронкавасць і размяшчэнне тэкстаў) засталіся тымі ж. Ён заўважыў, што старажытныя друкары аддавалі вялікую ўвагу чытэльнасці кніг — усе літары можна выдатна разгледзець, а ў наш час, калі прыдумана багата шрыфтоў, бывае, яны падаюцца малым памерам, або ў пагоні за прыгажосцю стваральнікі кніг забываюцца пра галоўнае правіла — зручнасць для чытача.

Таксама на выстаўцы пададзены элементы кніжнага пераплёту і старадрукаваныя кнігі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі. Калекцыя беларускіх кірыліч-

ных старадрукаў уключае кнігі па багаслоўі, царкоўнай гісторыі, філалогіі, навуковыя працы, мастацкія і рэлігійныя творы.

Асаблівае месца ў экспазіцыі займаюць выданні віленскай друкарні Мамонічаў, Пятра Мсціслаўца, Васіля Гарабурды. Дэманструецца кніжная прадукцыя выдавецкіх цэнтраў Вільні, Магілёва, Супрасля, Куцейны і іншых. Беларускія старадрукі лацінскага шрыфту прадстаўлены выданнямі друкарняў Брэста, Нясвіжа, Полацка, Вільні, Гродна, Магілёва, Слуцка. Сярод іх — надзвычай рэдкія асобнікі з брэсцкай і нясвіжскай друкарняў Радзівілаў.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пісьменніцкія вандроўкі

Балотны генерал, прывід карэты і сястра камісара

Таямніцы Завалочыцкай сядзібы

Здараецца, што нейкае месца падчас тваіх вандровак, нібыта не самае прыкметнае і выбітнае, чамусьці асабліва западае ў памяць. Хочацца даведацца пра яго пабольш, раскапаць нейкія неверагодныя гісторыі...

Так здарылася з нашым візітам у Завалочыцы, што ў Глускім раёне. Дом па вуліцы Савецкай, 9, мае на сабе адбітак разнастайнага карыстання... Якіх толькі кантор тут не месцілася! Хоць сёння мае сляды занядбання. Балкон, пазбаўлены парэнчаў, падтрымліваюць чатыры аблупленыя невялікія, шмат разоў фарбаваныя калоны, з-пад тынкоўкі паўсюль віднеецца чырвоная цэгла... На франтоне — лічбы «1914» і шыльда «УКСП совхоз Заволочицы».

Таварыства філаматаў і гліняныя трубы

Між тым Завалочыцы вядомыя з 1626 года як частка маёнтка Глуск Дубровіцкі, што належаў князям Дубровіцкім. Пераходзілі Завалочыцы ад гаспадара да гаспадара, у XIX стагоддзі належалі Якса-Быкоўскім герба «Грыф». Каля 1860 года Антаніна Быкоўская пабралася шлюбам з вельмі каларытным персанажам, Іосіфам Іпалітавічам Мордас-Жылінскім герба «Янына», які і стаў тут новым гаспадаром.

Іосіф Жылінскі — са старога шляхецкага роду. Яго бацька Іпаліт, колішні студэнт Віленскага ўніверсітэта, уваходзіў у знакамітае Таварыства філарэтаў, дзядзька Вацлаў быў віленскім біскупам. Маці Юстына паходзіла з роду Адынцоў. А сам Іосіф стаў ваенным інжынерам, геадэзістам, даслужыўся да генерала ад інфантэрыі, а займаўся найперш асушэннем балот. Менавіта ён кіраваў работамі па асушэнні Палесся, пакінуў аб тым шмат манаграфій, а яго Генеральны план асушэння Палесся атрымаў залаты медаль на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы ў 1878 годзе.

У пасагу Антаніны Быкоўскай была вёска Дварэц, якая знаходзіцца непадалёк... Але Дварэц далекавата ад Маскоўска-Варшаўскай шашы, якой Жылінскі часта карыстаўся. Вось ён і вырашыў пабудавацца тут, каля самога тракту, у Завалочыцах — для чаго ўчыніў спачатку меліярацыю тэрыторыі, бо было спрэс балота. Дасюль ёсць пракапаныя па праекце генерала канавы ды сажалкі — недарэмна пана Іосіфа празвалі Балотным генералам. Некаторыя меліярацыйныя каналы дасюль дзейнічаюць. Самы вялікі — ад вёскі Паляна, праз сажалку ў Завалочыцах і далей да Пцічы. А ў зямлі завалочыцкай навокал закапаныя гліняныя трубы. Нядаўна аралі ў кагось з вяскоўцаў агарод, зноў трубу такую вывернулі — і здзівіліся: сто гадоў прайшло, а як новая!

Мужны Рыбак

Але датычна вадкасцяў думаў Жылінскі не толькі пра балотную ваду...

Мы абыходзім дом з чатырма калонамі і рушым да будынкаў, што ўзведзены генералам ад інфантэрыі ў Завалочыцах... А менавіта да карпусоў спіртзавода. Каларытныя будынкі на каменных падмурках, дэкаратыўныя элементы з чырвонай цэглы... На фасадзе той жа цэглай на фоне белай тынкоўкі выкладзены лічбы — 1889, 1888. Сцены некаторых невялікіх будынкаў цалкам з мясцовых валуноў, што ў спалучэнні з паўкруглымі наверсе вокнамі дадае сярэднявечнага каларыту. Сёння тут ціха, але яшчэ нядаўна віравала жыццё і спраўна выраблялася прадукцыя.

Дарэчы, тут, на спіртзаводзе, амаль паўстагоддзя працаваў жыхар Завалочыц, Герой Савецкага Саюза, знакаміты разведчык Ульян Рыбак. Ён дзевятнаццацігадовым хлопцам пайшоў адсюль на фронт. Маршал Маскаленка згадваў пра яго ў сваіх мемуарах, дый шмат яшчэ хто. Пра адважнага беларуса пісала франтавая прэса і складаліся прыпеўкі:

«Разведчик храбрый
и толковый
Фашистам спуску не дает:
Ульян всегда придет
с уловом,
У Рыбака всегда клюет».

Гэта пра тое, што Ульян Рыбак прывёў дзясяткі каштоўных «языкоў». Пяць разоў быў паранены, удзельнічаў у парадзе Перамогі...



Сёння ў аграгарадку Завалочыцы ёсць вуліца, якая носіць імя героя, чалавека сціплага і мужнага.

Дарэчы, бываў у Завалочыцах і Алесь Адамовіч — незадоўга да смерці прыехаў адведаць сям'ю стрыечнага брата.

Паміж пахіленым драўляным плотам і будаваным Балотным генералам заводам нас сустракаюць «ахоўнікі» — статак коз на чале з барадатым правадыром. Той даволі напорысты, таму адступаем...

Прайграная жонка

Вяртаемся да сядзібнага дома.

Праўда, той, у якім жыў Іосіф Жылінскі, драўляны, з прыгожай разьбой, стаяў трохі ў іншым месцы. У Іосіфа і Антаніны нарадзіліся тры дачкі. Самая цікавая мясцовая легенда звязаная са старэйшай, Аляксандрай.

Закахалася тая ў суседняга памешчыка па прозвішчы Грыцэнка, які жыў у Глушы. Бацька быў катэгарычна супраць — абраннік славіўся як гуляка і карцёжнік. Але каханне — справа такая, што бацькоўскі супраціў толькі палу дадасць... Антаніна ўночы збегла з каханым, таемна павянчаліся ў царкве ў суседняй вёсцы Гарадок... Што ж, Балотнаму генералу давялося прызнаць той шлюб.

Ды жыццё маладых не задалося. Малады муж усё гэтак жа гуляў у карты і баляваў.

Аднойчы ў доме апынуліся выпадковыя госці — папрасіліся на начлег. Замілгалі ў руках карты... Пану Грыцэнку не шанцавала, але спыніцца ён быў не ў стане. Адна за другой часткі яго маёмасці пераходзілі да іншых... Урэшце — тут я сустрэла два варыянты развіцця падзей — ці муж сам паставіў на кон сваю жонку, ці яна сама прапанавала ў якасці прыза сябе, абы не іграў на апошняе, што заставалася, вёску Гарадок, якая належала маці Грыцэнкі... Здзелка адбылася, і прыгажуню Аляксандру выйграў адзін з выпадковых гасцей, доктар і барон Ян Якуб Афенбах.

І ў раніцу яна з'ехала з ім.

Насуперак абставінам, Аляксандра і Ян Афенбах адзін адно засімпатызавалі, урэшце ажаніліся, і новы саюз аказаўся шчаслівы і доўгі. Знайшла звесткі і пра тое, што сярэдняя дачка Іосіфа стала жонкай інжынера Караля Малахоўскага, які дапамагаў Жылінскаму ў асушэнні Палесся.

Альдона і Кацярына: сястра галоўнага чэкіста і злосная пані

Стары сядзібны дом, драўляны, на два паверхі, з разьбой, стаяў дзесьці каля цяперашняга дома культуры. Знайшла цікавінку: аканомам Жылінскага тут служыў Гедымін Юрый Булгак, а ягонай жонкай была Альдона, сястра знакамітага Фелікса Дзяржынскага. Сястра старэйшая, якая замяніла асірацеламу Жалезнаму Феліксу маці... З ёй ён шмат ліставаўся, Альдона ва ўсім малодшага брата падтрымлівала, пакінула пра яго кнігу ўспамінаў... Хоць, здаецца, Гедымін Булгак у пэўны час выставіў юнага рэвалюцыянера з дому.

Іосіф Жылінскі пасля рэвалюцыйных падзей выехаў у Польшчу... Але Завалочыцы ён пакінуў раней, пасля таго, як памерла жонка. Антаніна Жылінская з Быкоўскіх, дарэчы, пахаваная на Залатагорскіх могілках у Мінску, ад якіх засталося ўсяго некалькі надмагільных камянёў каля касцёла Святога Роха і Палаца мастацтва.

Завалочыцы выкупіў інжынер-будаўнік з Санкт-Пецярбурга Аляксандр Гатоўскі. Гаспадыняй тут зрабілася яго жонка Кацярына, пра якую таксама шмат легендаў. Нібыта такая ўжо злая была, жорсткая, бо бяздзетная. Паводле адной з легендаў, таксама звязанай з картамі, калі яе муж прайграў Завалочыцы, працягнула гульню за яго — і адыграласа. Сустракала згадку, што і сам Іосіф Жылінскі страціў Завалочыцы, бо прайграў іх Гатоўскаму ў карты.

Драўляны дом згарэў у 1912-м, і, зноў па чутках, спаліла яго сама Кацярына Гатоўская — каб атрымаць страхоўку і расплаціцца з картачнымі даўгамі мужа.

А пасля рэвалюцыі нібыта перабралася злосная пані ў Мінск, дзе зладзіла антыбальшавіцкую банду. Тая доўга страшыла гараджан, пакуль чэкісты Кацярыну Гатоўскую не прыстрэлілі.

Адбылося гэта ў 1921-м, у той жа год у Польшчы памёр былы ўладальнік Завалочыц Іосіф Жылінскі.

Прывідная карэта ў сутарэннях

Мы прабіраемся ў закінуты дом... Вузкія вітыя ўсходы стагадовай даўнасці вядуць наверх. А тут усё нагадвае дэкарацыі для нейкага постапакаліпсічнага фільма. Паламаная канторская мэбля, паперы на падлозе, шыльды — «Бухгалтэрыя», «Каса». А вось на фоне абадраных танных шпалераў у куце — камін, сведчанне старадаўнасці. Праўда, выглядае неяк дэкаратыўна, не падобна, каб ім апошнія часы нехта карыстаўся. Але ён дакладна ад ранейшых часоў. Ці не адзіная захаваная дэталь інтэр'еру... Бо чаго толькі не было ў гэтых сценах! Клуб, бібліятэка, пошта, ашчадная каса, крама, кантора саўгаса... Нават хлебапякарня. А вось мяхі з мукой захоўваліся ў сутарэннях...

Мая любімая частка падарожжаў — званіцы і сутарэнні. У сутарэннях сядзібы Завалочыц можна фільмы жахаў здымаць... Вузкія дзверы, цёмная цэгла, паламанае крэсла пад абрыўкамі дроту, якія звісаюць са скляпеністай столі, нібыта цягнуцца кіпцюры...

Дарэчы, пра монстраў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў доме была нямецкая камендатура, і тут, у сутарэннях, трымалі схопленых партызанаў і падпольшчыкаў.

У пасляваенны час у падвале Завалочыцкай сядзібы зладзілі бамбасховішча — муры магутныя, надзейныя.

Але ёсць і класічная містыка. Рабочыя пякарні, якім даводзілася бываць тут ноччу, распавядалі, што часам выразна чулі гукі, нібыта пад'язджае карэта, цокаюць падковы, іржуць коні, гучаць мужчынскі і жаночы галасы... Зразумела, у легендзе тут жа ўзнікла нейкая «царыца», якая праязджала трактам, і ці то захварэла ў Завалочыцах, ці то памерла...

Азіраемся на дом — яго фасад калісь упрыгожваў порцік... Навошта той порцік разбурылі? Заўсёды задаю сабе гэтае пытанне... Змагаліся з панскімі вычварэнствамі? Злавала «нефункцыянальная прыгажосць»? Аказваецца, на балконе яшчэ нядаўна былі старыя каваныя парэнчы, знялі нібыта для рэстаўрацыі, ды так і не вярнулі. І прысады з бэзу і ліп яшчэ нядаўна раслі...

Але будынак нават у цяперашнім стане вылучаецца, прыцягвае турыстаў... Страшэнна шкада, што ён не ўнесены ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Бо пакуль яшчэ — не руіны, яшчэ ўсё можна рэстаўрыраваць, зрабіць цудоўны аб'ект.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности Молодечненского района и в хозяйственном ведении **УП «ИНСТИТУТ МОЛОДЕЧНОПРОЕКТ»** (Продавец)

Лот № 1:

ПОМЕЩЕНИЕ БЫТОВОГО ОБСЛУЖИВАНИЯ НАСЕЛЕНИЯ,

инв. № 630/D-42434, 881,1 кв. м

Местонахождение: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Будавников, 15А-4.
Начальная цена без НДС – 242 000,00 руб.

Аукцион состоится **31.03.2022 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by,** Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by,** Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

